Былі адходы – стала паліва

СТАР. 5

Міяпія: правілы для прафілактыкі

СТАР. 6

Не знішчайце апалае лісце

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СЕРАДА № 192 (28302)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВОСЕНЬСКІЯ ЎВАХОДЗІНЫ

Ключы ад новых кватэр днямі атрымалі 132 сям'і ваеннаслужачых унутраных войскаў з вайсковых часцей Мінскага гарнізона. Жылы шматкватэрны дзевятнаццаці-павярховы дом па вуліцы Маякоўскага для сем'яў ваеннаслужачых урачыста адкрыў намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі — камандуючы ўнутранымі войскамі Юрый Караеў.

Фота БЕЛТА.

Навасельцы Марына, Крысціна і Данііл МАКАРАНКІ.

Сям'я навасельцаў Андрэя і Таццяны УСЦЬЯНАЎ і намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі — камандуючы ўнутранымі войскамі Юрый КАРАЕЎ запускаюць ката ў новую кватэру.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:

«Аднаўленчы рост традыцыйнай эканомікі, загрузка магутнасцяў і зніжэнне выдаткаў забяспечыць каля паловы прыросту ВУП у наступным годзе. Для паскарэння эканамічнага росту ў 2018 і 2019 гадах аснову неабходна закласці ў 2016-м і першай палове 2017 года. Для гэтага ўвага будзе ўдзелена шэрагу напрамкаў эканамічнай палітыкі. Гэта сістэмнае паляпшэнне інвестклімату, зніжэнне адміністрацыйнай і кантрольнай нагрузкі на бізнес, ліквідацыя залішняй колькасці і стварэнне новых працоўных месцаў, фінансавае аздараўленне арганізацый рэальнага сектара эканомікі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.10.2016 г.

Долар ЗША	1,9178	▲
Еўра	2,1427	▼
Рас. руб.	0,0307	▲
Укр. грыўня	0,0741	▲

Асноўная мэта сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2017 годзе — рост канкурэнтаздольнасці эканомікі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №358 «Аб задачах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2017 год», паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Асноўная мэта сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2017 годзе — рост канкурэнтаздольнасці эканомікі і стварэнне ўмоў для дасягнення мэт Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.

У дакументе таксама вызначаны ключавыя задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2017 год: забеспячэнне макраэканамічнай збалансаванасці, фінансавае аздараўленне арганізацый рэальнага сектара эканомікі, стварэнне эфектыўнай сістэмы занятасці, рост прадукцыйнасці працы, стварэнне новых рабочых месцаў, павышэнне эфектыўнасці кіравання дзяржаўнай маёмасцю, уключэнне ў эканамічны абарот неэфектыўна выкарыстоўваемай дзяржаўнай маёмасці, паляпшэнне інвестыцыйнага клімату, зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на бізнес.

Базай захавання макраэканамічнай стабільнасці ў 2017 годзе паслужыць зніжэнне інфляцыі да ўзроўню, які не перавышае 9 працэнтаў, прыцягненне прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове ў суме $1,4 млрд.

Валавы ўнутраны прадукт у 2017 годзе прагназуецца на ўзроўні 101,7 працэнта адносна 2016 года.

У знешнім гандлі прадугледжваецца забяспечыць дадатную дынаміку — тэмп росту экспарту тавараў і паслуг на ўзроўні 103,8 працэнта да 2016 года.

Прадукцыйнасць працы прагназуецца на ўзроўні 101,8 працэнта да папярэдняга года. Пры гэтым прадукцыйнасць працы будзе перавышаць тэмп росту рэальнай заработнай платы (101,5 працэнта) і рэальных наяўных грашовых даходаў насельніцтва (101,3 працэнта).

Зацверджаны Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №359 «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2017 год». Аб гэтым паведаміла прэс-служба беларускага лідара.

СТАР. 2

І НІЯКІХ МІФАЎ

Магілёўскім студэнтам паказалі, што ў «чарнобыльскіх» раёнах таксама можна жыць

Мара любога студэнта атрымаць дыплом і застацца працаваць дзесьці ў горадзе, мець годны заробак і ўсе перавагі маладога спецыяліста. Але такое шчасце свеціць далёка не ўсім. І хочаш ты таго або не, але прыйдзецца пакаваць чамаданы і ехаць працаваць у якую-небудзь аддаленую вёсачку. І не выключана, што пашкоджаную Чарнобылем. Адкуль тут узяцца настрою?

Спа-капсула многім прыйшлася даспадобы.

АНТЫКРЫЗІСНЫ МЕНЕДЖМЕНТ

У тым, што там не так усё дрэнна, як думаюць некаторыя, будучых маладых спецыялістаў узялося пераканаць аддзяленне Расійска-беларускага інфармацыйнага цэнтра па праблемах наступстваў катастрофы на ЧАЭС Інстытута радыялогіі МНС Беларусі. З часу аварыі на Чарнобыльскай АЭС сёлета споўнілася 30 гадоў, але не ва ўсіх атрымалася цалкам пераадолець радыефобію. Інфармацыйны цэнтр распрацаваў экскурсіі для студэнтаў у «чарнобыльскія» раёны, якія дапамагаюць ліквідаваць прабелы ў іх ведах па радыяцыйнай бяспецы. Праект фінансуецца з бюджэту Саюзнай дзяржавы.

Пакуль ён рэалізуецца на тэрыторыі Беларусі, але яго непасрэдныя стваральнікі ўжо падумваюць, як арганізаваць пазнавальныя паездкі ў кранутыя Чарнобылем раёны для расійскай моладзі. Ды і нашым студэнтам было б каьі.рысна паглядзець, як агульная для дзвюх краін праблема вырашаецца на суседняй тэрытор

СТАР. 3

Да лекараў без талонаў

На спецыялізаванай выставе-кірмашы «Віцебшчына — за здаровы лад жыцця» можна было азнаёміцца з навінкамі медыцынскіх паслуг, атрымаць парады медыкаў і тых, хто пазбавіўся ад шкодных звычак. Можна было таксама пакаштаваць карысныя для здароўя прадукты. Дзявятая па ліку выстава працавала на працягу двух дзён у канцэртнай зале «Віцебск». Яе наведалі тысячы гараджан і гасцей горада. Сярод іх быў і карэспандэнт «Звязды», які шмат чаму навучыўся і пажадаў кінуць курыць.

База для алімпійцаў

Ганаровая цырымонія адкрыцця «форума здароўя» адбылася з удзелам маладых спартсменаў і танцораў. Арганізатараў і наведвальнікаў выставы павітаў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ:**

— Заняткі спортам і фізкультурай, правільнае харчаванне і адмова ад шкодных звычак — тры асноватворныя фактары здаровага ладу жыцця. У Беларусі робіцца шмат для таго, каб людзі маглі сачыць за сваім здароўем. Асабісты прыклад таго, як захоўваць добрую фізічную форму, паказваюць кіраўнікі краіны і вобласці...

СТАР. 5

Паказальныя выступленні юных гараджан.

ISSN 1990 - 763X

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



Прэзідэнтам Эстоніі ўпершыню выбрана жанчына

Новым лідарам Эстонскай Рэспублікі стала Керсці Кальюлайд. Прадстаўнік Эстоніі ў Еўрапейскай падліковай палаце Керсці Кальюлайд стала адзіным кандыдатам на праведзеных прэзідэнцкіх выбарах. За яе прагаласаваў 81 дэпутат пры неабходных 68 галасах. Галасаванне ў парламенце стала трэцяй спробай абрання прэзідэнта краіны, дзве папярэднія былі няўдалымі.

СМІ: Расія даставіла ў Сірыю найноўшую сістэму ППА

Расія даставіла ў Сірыю найноўшую сістэму армейскай ППА С-300В4 звышдалёкага дзеяння, здольную збіваць крылатыя ракеты. Пра гэта паведамляе Fox News са спасылкай на крыніцы ў Вашынгтоне. Комплекс, па даных амерыканскай разведкі, быў дастаўлены ў мінулыя выхадныя на ваенна-марскую базу ў сірыйскім Тартусе. Як адзначае Fox News, гэта першы выпадак размяшчэння С-300В4 за межамі Расіі. Пры гэтым крыніцы паказваюць, што ў «Ісламскай дзяржавы» і «Джэбхат ан-Нусры» няма авіяцыі і крылатых ракет, супраць якіх прызначаны дадзены комплекс. Таму з'яўленне С-300В4 у Сірыі можа азначаць, што Расія прыкладае намаганні для абароны ад патэнцыйнага нападу з боку ЗША і іх саюзнікаў.

У Турцыі звольнены каля 13 тысяч паліцэйскіх

Турэцкія ўлады звольнілі 12,8 тысячы паліцэйскіх. Сілавікі падазраюцца ў сувязях са структурамі і арганізацыямі, падкантрольнымі ісламскаму прапаведніку Фетхуллаху Гюлену. З іх больш за 2,5 тысячы займалі кіруючыя пасады.

У Польшчы прайшлі пратэсты жанчын супраць забароны абортаў

У Польшчы адбыліся масавыя маніфестацыі жанчын, якія выступаюць супраць прыняцця закона аб поўнай забароне на аборты. Акцыя атрымала назву «Чорны пратэст» — удзельніцы па прызыву арганізатараў апраналіся ва ўсё чорнае. Акрамя таго, скарыстаўшыся правам на дзень водпуску паводле свайго меркавання, жанчыны не выйшлі на працу. Пратэсты прайшлі ў найбуйнейшых гарадах краіны — Кракаве, Вроцлаве, Гданьску, Беластоку, Шчэціне, Познані і многіх іншых. Паводле інфармацыі ўлад Варшавы, у цэнтры горада, нягледзячы на дажджлівае надвор'е, сабраліся каля 30 тысяч чалавек. Як паведамляецца, у мітынгах прынялі ўдзел і мужчыны. Пратэсты ў Польшчы працягваюцца ўжо больш за тыдзень — з таго часу, як сейм Польшчы прагаласаваў у першым чытанні за законапраект аб поўнай забароне абортаў і ўвядзенні крымінальнай адказнасці за іх здзяйсненне.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Дарослага чалавека ўпершыню вылечылі ад ВІЧ

Добрыя навіны з Вялікабрытаніі. У медыкаў атрымалася вылечыць ад ВІЧ-інфекцыі дарослага чалавека. Гэта першы падобны выпадак у сусветнай медычнай практыцы, інфармуе The Sunday Times. Займаліся лячэннем спецыялісты з Оксфардскага і Кембрыджскага ўніверсітэтаў, а таксама Універсітэцкага і Каралеўскага каледжаў Лондана. Цалкам пазбавіцца хваробы ўдалося 44-гадоваму жыхару Вялікабрытаніі.

КАРОТКА

Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі сёння, 5 кастрычніка, з-за моцнага ветру, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Два беларускія банкі, «Прыёрбанк» і банк «Рашэнне», увялі забарону на зняцце наяўных грошай у некаторых краінах. Увядзенне такога абмежавання ажыццёўлена для скарачэння рызык, звязаных з махлярствам, і забеспячэння захаванасці грашовых сродкаў кліентаў.

Будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» будзе завершана ў 2018 годзе.

Прага, Мінск і Талін уваходзяць у першую тройку замежных гарадоў, папулярных для навагодніх падарожжаў сярод расіян. Паводле даных RoomGuru.ru, у Прагу, Мінск і Талін плануюцца паездкі на навагоднія святы ў сярэднім на 3—5 дзён, а пражыванне ў дні навагодніх свят абыдзецца там ад 40 да 50 еўра ў суткі.

■ Выпрабавана на сабе

ПРАВІЛЬНА ЗНЯЦЬ, КАБ ГРАШЫМА НЕ РЫЗЫКАВАЦЬ

ЯК Я ШУКАЛА КВАТЭРУ НА СУТКІ

Не так даўно на сувязь праз скайп выйшла сваячка з Санкт-Пецярбурга:

— Выручайце, патрэбна кватэра на пяць сутак у Мінску.

— Валянціна Анатолеўна, навошта вам, грошы лішнія? Спыніцеся ў нас, — прапанавалі ёй з мужам.

— Ды, не, — адмовілася Валянціна. — Са мной едуць дзве супрацоўніцы. Не хачу злоўжываць вашай гасціннасцю. Я ўжо заказала двухпакаёўку ў цэнтры Мінска па інтэрнэце, нават папярэднюю аплату ўнесла. Але гаспадыня патэлефанавала, што жыллё залілі суседзі зверху. Паабяцала вярнуць грошы. Так і не дачакалася, «развялі» мяне, як дурніцу. Там будзе праходзіць патрэбны мне семінар. Пажадана, каб жыллё было непадалёку ад месца правядзення мерапрыемства або каля метро. І не даражэй як 35 еўра за суткі.

— Абавязкова дапаможам, не хвалюйцеся, Анатолеўна, — паабяцалі ёй.

На наступны дзень заходжу ў інтэрнэт, уводжу ў пашукавік фразу «Зняць кватэру на суткі ў Мінску без пасрэднікаў». Высвеціліся тысячы аб'яў. Пасля карпатлівага двухгадзіннага адбору спынілася на дзясятку адна- і двухпакаёвак, даступных па цане, — ад 30 да 40 долараў. Тэлефаную Веры, якая прапаноўвае кватэру каля станцыі метро «Няміга». Але яна скідвае званок.

СТАР. 5

Зацверджаны Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Грашова-крэдытная палітыка ў 2017 годзе захавае пераемнасць і будзе садзейнічаць устойліваму і збалансаванаму развіццю эканомікі Беларусі шляхам падтрымання цэнавай стабільнасці.

Асноўнай мэтай грашова-крэдытнай палітыкі стане зніжэнне інфляцыі, што вымяраецца індэксам спажывецкіх цэн, да 9 працэнтаў. Прадоўжыцца правядзенне грашова-крэдытнай палітыкі ў рэжыме манетарнага таргетавання, якое прадугледжвае кантроль над грашовым прапанаваннем. У якасці прамежкавага арыенціра манетарнай палітыкі па-ранейшаму будзе выкарыстоўвацца шырокая грашовая маса, у якасці аперацыйнага — рублёвая грашовая база. Прырост сярэдняй шырокай грашовай масы прагназуецца на ўзроўні 12—16 працэнтаў.

У 2017 годзе Нацыянальны банк прадоўжыць работу па развіцці фінансавага рынку і плацежнай сістэмы, умацаванні даверу да нацыянальнай грашовай адзінкі і зніжэнні даларызацыі эканомікі, фарміраванні ўмоў для далейшага павышэння стандартаў і якасці банкаўскіх паслуг.

■ Ёсць кантакт

Да сустрэчы з парламентарыямі свету

Старшыня Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Крысцін Мутонен наведае Беларусь. Дэталі яе візіту абмяркоўваліся на сустрэчы з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам Гумінскім у межах яго ўдзелу ў восеньскім пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Скоп'і (Македонія). Асобным пунктам размовы стала падрыхтоўка да правядзення 26-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ ў Мінску ў наступным годзе.

Акрамя гэтага, Віктар Гумінскі абмеркаваў сітуацыю ва Украіне з Генеральным сакратаром АБСЕ Ламбэртам Заньерам. Спадар Заньер адзначыў, што Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе высока ацэньвае ролю Беларусі ва ўрэгуляванні крызісу ў краіне-суседцы. Станоўча была адзначана і дамоўленасць, якая няздаўна дасягнута ў Мінску ў фармаце трохбаковай кантактнай групы па Украіне аб развядзенні сіл і сродкаў.

Высокую зацікаўленасць да нашай краіны праявілі і парламентарыі іншых дэлегацый, напрыклад Аўстрыі, Арменіі, Балгарыі, Швейцарыі. Віктар Гумінскі правёў з імі шэраг двухбаковых сустрэч.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

■ Рэгіён

ІНВЕСТАРАМ — ЗЯЛЁНАЯ ВУЛІЦА

Як выконваецца праграма жыллёвага будаўніцтва? Якія сумесныя праекты ажыццяўляюцца з кітайскімі партнёрамі? Што робіцца, каб скарыстацца новымі магчымасцямі для наведвання рэгіёна турыстамі? На гэтыя і іншыя пытанні журналістаў адказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Новы погляд на адходы

На Гродзенскім заводзе па ўтылізацыі і механічным сартаванні адходаў, пабудаваным за сродкі Сусветнага банка, з'явіцца больш за 200 рабочых месцаў. Чакаецца, што ён будзе перапрацоўваць да 120 тысяч тон смецця ў год. Плануецца сартаваць і накіроўваць на перапрацоўку амаль усе адходы абласнога цэнтра. Цяпер каля жылых дамоў будуюцца новыя і прыводзяцца ў належны стан існуючыя пляцоўкі, дзе ўстанаўліваюцца сучасныя кантэйнеры для пластыку, паперы, шкла і іншых адходаў, набываецца неабходная тэхніка. Дарэчы, дзеля павышэння дасведчанасці гродзенцаў у пытаннях раздзельнага збору смецця для іх арганізуюць экскурсіі на перапрацоўчае прадпрыемства. Аб гэтым даведаліся журналісты, пабываўшы перад пачаткам прэс-канферэнцыі на заводзе, які неўзабаве будзе ўведзены ў эксплуатацыю.

Дзякуючы інвестарам на Гродзеншчыне будуюцца і іншыя важныя аб'екты. У прыватнасці, у памежнай вобласці імкнуцца скарыстацца сваім транзітным патэнцыялам і актыўна развіваюць транспартна-лагістычныя паслугі з укараненнем сучасных тэхналогій, якія паскараюць афармленне грузаў. Уладзімір Краўцоў паведаміў, што буйны лагістычны цэнтр неўзабаве распачне работу ў раёне пункта пропуска «Брузгі», а ў наступным годзе такія цэнтры павінны з'явіцца каля пунктаў пропуску «Бераставіца» і «Каменны Лог».

У рэчышчы сумесных спраў

Уладзімір Краўцоў зазначыў, што ўсё больш плённымі становяцца партнёрскія сувязі з кітайскімі партнёрамі. Шэраг сумесных праектаў абмеркавалі нядаўна з дэлегацыяй правінцыі Ганьсу, якая ўдзельнічала ў выстаўцы-кірмашы «Еўрарэгіён «Нёман». А ўжо зараз з удзелам інвестыцый КНР у Гродне ствараецца цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны, «другое жыццё» атрымае гасцініца, а таксама пабудуюць тры жылыя дамы, адзін з якіх, дзевяціпавярховік, намечана здаць «пад ключ» у першым паўгоддзі 2017-га. Акрамя таго, за сродкі кітайскай крэдытнай лініі плануецца ажыццявіць вельмі важную для абласнога цэнтра задачу з пункту гледжання транспартнай лагістыкі і скарачэння нагрузкі на цэнтральную частку горада — рэканструяваць чыгуначны мост цераз Нёман пад аўтадарожны.

Разам з тым кітайцы ўжо зацікавіліся некаторымі таварамі прадпрыемстваў Гродзеншчыны, і трэба падмацаваць гэта канкрэтнымі кантрактамі. На думку Уладзіміра Краўцова, прарыўным тут можа стаць буйны кантракт Беллакта на пастаўку ў Паднябесную дзіцячага харчавання. Цяпер на завяршальнай стадыі знаходзіцца яго ацэнка адпаведнымі кітайскімі службамі.

Жыллёвая праграма будзе выканана

Сярод прыярытэтных задач і экспарт будаўнічых паслуг. Нашы будаўнічыя арганізацыі зараз узводзяць жыллё ў Калузе, Падмаскоўі, ёсць перспектывы і ў іншых расійскіх рэгіёнах. Што не перашкодзіць выканаць усё запланаванае на гэты год па жыллёвым будаўніцтве на тэрыторыі Гродзеншчыны. Да таго ж на нядаўнім пасяджэнні аблвыканкама, дзе абмяркоўвалі сітуацыю ў гэтай сферы, паставілі задачу зрабіць усё магчымае, каб захаваць адносна невысокі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі кошт будаўніцтва шматкватэрнага жылля з дзяржаўнай падтрымкай, чаго можна дасягнуць скарачэннем затрат, у прыватнасці, аптымізацыяй закупак і паставак на аб'екты матэрыялаў, маршрутаў руху тэхнікі, недапушчэннем браку і, канешне, не зацягваючы тэрміны будаўніцтва.

— Варта таксама сур'ёзна вывучыць пытанне будаўніцтва жылля прадпрыемствамі і арганізацыямі для сваіх работнікаў, — лічыць Уладзімір Краўцоў. — У свой час такая практыка сябе апраўдала, а цяпер падобных прыкладаў няшмат. Мажліва, да гэтага трэба вярнуцца.

Новыя перспектывы адкрываюцца на Гродзеншчыне ў турыстычнай сферы, што звязана з бязвізавым уездам замежных гасцей на тэрыторыю турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал», плануемымі мерамі па бязвізавым наведванні нашай краіны праз паветраныя вароты, а таксама з рэканструкцыяй аўтадарогі М6 Мінск-Гродна.

— Усё гэта дазволіць турыстам хутка, зручна і бесперашкодна наведваць турыстычныя аб'екты рэгіёна, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

Цяпер вядзецца работа па развіцці авіязносін праз гродзенскі аэрапорт — пералётаў лаўкостамі. Шмат трэба зрабіць да адкрыцця наступнага турыстычнага сезона і па ўдасканаленні інфраструктуры ў раёне Аўгустоўскага канала.

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што польскі бок станоўча ацаніў рашэнне аб бязвізавым уездзе турыстаў у зону Аўгустоўскага канала. Кіраўнік Падляскага ваяводства выказаў жаданне стаць першым турыстам, які скарыстаецца такой магчымасцю.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Грошы

Наяўным далі «індульгенцыю»

Мінімум — да новага года

Менавіта так каментуюць спецыялісты рашэнне Беларусбанка аб чарговай адтэрміноўцы камісіі за плацяжы наяўнымі беларускімі рублямі праз касы банка.

У прэс-службе гэтай фінансавай установы паведамілі, што такое рашэнне прынята ў сувязі з неабходнасцю правядзення дадатковай работы па павышэнні фінансавай адукаванасці насельніцтва. Тут трэба нагадаць, што гэты банк анансаваў увядзенне платы за наяўныя аперацыі ў сваіх касах з 1 жніўня, але потым тэрмін з'яўлення спецыяльнай камісіі перанеслі на 1 кастрычніка.

Як паведамляла «Звязда», новаўвядзенне не павінна было закрануць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны па ўсёй лінейцы плацяжоў і астатніх кліентаў па асобных пазіцыях. Напрыклад, не збіраўся банк браць камісію пры плацяжах у бюджэт і пры выкананні абавязацельстваў перад банкам (пагашэнне крэдытаў, плацяжы за паслугі банка). Не прадугледжвалася камісія таксама і за залічэнні на дабрачынныя рахункі і рахункі фізічных асоб, якія адкрыты ў Беларусбанку.

Цяпер фінансавая ўстанова паведамляе, што кіраўніцтва Беларусбанка прыняла рашэнне аб пераносе ўводу камісіі на нявызначаны тэрмін дзеля таго, каб спачатку павысіць фінансавую адукаванасць насельніцтва, зрабіць больш папулярнымі плацяжы з дапамогай каналаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА), банкаматаў і інфакіёскаў з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЗАПРАШАЮЦЬ МАШТАБНЫЯ СЕЛЬГАСКІРМАШЫ

Два маштабныя агульнагарадскія сельскагаспадарчыя кірмашы пройдуць у найбліжэйшыя выхадныя, 8—9 кастрычніка, у сталіцы, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

З 9 да 16 гадзін кірмаш выхаднога дня разгорнецца на пляцоўцы, якая прылягае да вялікай арэны «Чыжоўка-Арэна», дзе сельскагаспадарчую прадукцыю прадставяць прадпрыемствы Гродзенскай вобласці: Гродзенскі, Лідскі, Ваўкавыскі, Ашмянскі і Слонімскі мясакамбінаты, Лідскі малочна-кансервавы камбінат, Малочная кампанія «Навагрудскія дары», Шчучынскі масласырзавод, Дзятлаўскі сыраробны завод, Гродзенская агароднінная фабрыка, фермерскія гаспадаркі, птушкафабрыкі, рыбгасы, прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі і іншых. У гэты ж час адбудзецца агульнагарадскі сельскагаспадарчы кірмаш выхаднога дня на пляцоўцы каля Палаца спорту з удзелам прадпрыемстваў Мінска, Мінскай вобласці, Белкаапсаюза, Белвадгаса і іншых. Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і людзям з абмежаванымі магчымасцямі забяспечаць бясплатную дастаўку сельгаспрадукцыі.

ДАДАТКОВЫ ПОЕЗД НА ГОМЕЛЬ

Беларуская чыгунка прызначае дадатковы дзённы поезд міжрэгіянальных ліній бізнес-класа №717/718 Гомель — Мінск з 9 кастрычніка.

Гэта зроблена з мэтай задавальнення попыту насельніцтва ў перавозках у дадзеным напрамку. Поезд Гомель — Мінск будзе курсіраваць да 4 лістапада ў дзённы час па пятніцах і нядзелях, а таксама 7 лістапада, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. З Гомеля ён будзе адпраўляцца ў 11.00 і прыбываць у Мінск у 13.59. У зваротным напрамку поезд №718 будзе адпраўляцца ў 14.47 і прыбываць у Гомель у 18.20 з прыпынкамі ў Бабруйску ў 16.23 і Жлобіне ў 17.10.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

МТС ПЕРАГЛЯДАЕ ТАРЫФЫ

Аператар МТС з 14 кастрычніка павысіць кошт паслуг на шэрагу тарыфных планаў мабільнай сувязі.

Змены, у залежнасці ад тарыфу, закрануць памер абаненцкай платы, а таксама кошт званкоў па Беларусі і SMS-паведамленняў. Тарыфы на інтэрнэт-паслугі і паслугі сувязі ў роўмінгу застануцца ранейшымі.

На тарыфных планах «Блізкі. Для пенсіянераў», «Лёгка сказаць», «МТС СМАРТ Гасцявы», «Ультра» і «Абсалют» змяненняў у памеры штомесячнай платы не адбудзецца. Тарыфы на званкі абанентам МТС і кліентам іншых беларускіх аператараў на планах «Блізкі. Для пенсіянераў» і «Выдатны» таксама застануцца нязменнымі. Акрамя гэтага, карэктывы ў кошце размоў у сетцы МТС не закрануць шэраг архіўных тарыфных планаў і ўсе тарыфы папулярнай лінейкі «МТС СМАРТ».

З новымі тарыфнымі прапановамі можна азнаёміцца на сайце кампаніі МТС.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

Спадзяёмся на лепшае, але і да горшага гатовы

Бюджэтны пакет дакументаў на 2017 год разглядаецца сёння ў другім чытанні

Парламентарыі глядзяць у будучыню з аптымізмам, нягледзячы на тое, што бюджэт фарміруюць па кансерватыўным, гэта значыць, песімістычным, сцэнарыі. Прадугледжваецца рост ВУП, хоць і невялікі — 100,2%, цана на нафту закладзена ў памеры 35 долараў за барэль, курс расійскага рубля — 75 рублёў за долар. Ці прыдзецца зноў падцягваць паясы? Аналізуем бюджэт на наступны год.

Эканоміка будзе расці

У праекце рэспубліканскага бюджэту стаўка рэфінансавання закладзена ў памеры 15-17%. У той жа час плануецца яе паступова памяншаць — гэта прадугледжвае Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на 2016—2020 гады. Згодна з ёю, да канца 2020 года яна павінна скласці 9—11% гадавых.

Чым ніжэй працэнтная стаўка, тым больш надзейнай выглядае фінансавая сітуацыя ў краіне і тым больш даступныя грошы, чытай, крэдыты. Чым больш яны даступныя, тым больш іх укладваецца ў эканоміку, як вынік — яна развіваецца.

Нагадаем, што ў пачатку бягучага года стаўка рэфінансавання складала 25%, яна была зніжана 1 красавіка да 24%, 1 мая — да 22% і першага ліпеня да 20%. З 17 жніўня ў краіне дзейнічае 18%-ая стаўка рэфінансавання. А на днях **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** паведаміў, што ўжо да канца 2017 года стаўку рэфінансавання плануецца знізіць да 14—16%.

Добры рэйтынг у вачах крэдытораў

Прафіцыт бюджэту ў 2017 годзе складзе 1 496,2 млн рублёў. У праекце бюджэту на бягучы год ён планаваўся ў памеры 1 570 мільёнаў — гэта значыць, сумы прыкладна роўныя.

Цікава, што ў большасці краін свету бюджэт увогуле фарміруецца з невялікім дэфіцытам, а ў суседняй Расіі ёсць нават адпаведная норма ў заканадаўстве, згодна з якой бюджэт вярстаецца без прафіцыту. Тым не менш у наяўнасці апошняга ёсць шэраг плюсаў. Па-першае, у бюджэце ёсць запас, што называецца, на «чорны дзень». Па-другое, краіне, у бюджэце якой ёсць прафіцыт, больш давяраюць у свеце — яна мае добры рэйтынг у вачах і крэдытораў, і кампаній-інвестараў. Па-трэцяе, лішак у «фінансавым плане» дае магчымасць больш свабодна развівацца бізнесу, бо ў дзяржавы няма рэзону рабіць больш жорсткай падатковую палітыку.

Такім чынам, прафіцыт у бюджэце — гэта гарантыя стабільнасці дзяржавы. Плануючы яго, урад абараняе краіну ад незапланаваных фінансавых праблем.

У прыярытэце — сацыяльная накіраванасць

Кожны раз пры абмеркаванні бюджэту ўрад робіць акцэнт на тым, што фінансавы план на наступны год заснаваны ў першую чаргу на сацыяльных патрэбах. Гэта адпавядае замацаванаму ў Канстытуцыі азначэнню Беларусі як сацыяльнай дзяржавы. Сёлета ў прыярытэце — фінансаванне аховы здароўя і адукацыі. Прадугледжана таксама фарміраванне сямейнага капіталу ў суме 457,8 млн рублёў. Акрамя гэтага, значную частку ў бюджэце складуць расходы на аплату працы, пенсіі, стыпендыі, дапамогі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў.

Даходы дзяржавы

Згодна з праектам бюджэту на наступны год яны прадугледжваюцца ў суме 18 235,2 млн рублёў, або з ростам да чаканага выканання 2016 года на 6,1%. Асноўныя крыніцы падатковых даходаў: падатак на даданую вартасць, акцызы, падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці. Выдаткі прадугледжваюцца ў памеры 16 739,1 млн рублёў, або 98,9% да чаканага выканання 2016 года.

Нягледзячы на тое, што дагэтуль невызначана цана расійскага газу для нашай краіны, вялікіх рызык у сувязі з гэтым для беларускай эканомікі няма. Бюджэт не залежыць напрамую ад гэтага паказчыка, і, як растлумачыў міністр фінансаў Уладзімір Амарын журналістам, цана на газ — «гэта камунальныя паслугі, якія аплачваюць бюджэтныя арганізацыі». Урад заклаў іх на ўзроўні інфляцыі, таму ў любым выпадку для бюджэту тут вялікіх рызык няма.

Абарона насельніцтва

Традыцыйна напярэдадні прыняцця галоўнага фінансавага дакумента на наступны год прымаецца бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда сацыяльнай абароны насельніцтва. Даходы фонду ў наступным годзе складуць 12,9 млрд рублёў. У адносінах да ВУП гэта — 1,8%. Выдаткі пазабюджэтнага фонду разлічаны ў суме 12,6 млрд рублёў, такім чынам, прафіцыт пазабюджэтнага фонду складзе прыкладна 270 мільёнаў. Асноўная сума выдаткаў — 9,6 млрд рублёў — накіроўваецца на пенсійнае забеспячэнне. На выплату дапамог па часовай непрацаздольнасці па догляду дзіцяці, дапамог па догляду інваліда першай групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, на пахаванне накіравана 2,8 мільярда.

«Як бы ні развівалася сітуацыя (а сёння ў нас 2 млн 605 тыс. пенсіянераў), мы павінны з боку дзяржавы гарантаваць узровень пенсій не ніжэйшы за 40% сярэдняй заработнай платы, — заявіла падчас разгляду бюджэтнага пакета ў першым чытанні Марыяна Шчоткіна, міністр працы і сацыяльнай абароны. — Менавіта для гэтага сёння зроблены пэўны запас і ў рэспубліканскім бюджэце».

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Меркаванне

Пакістан як беларускі партнёр

Прэзідэнт Беларусі 4—6 кастрычніка здзяйсняе афіцыйны візіт у Ісламскую Рэспубліку Пакістан. Працягласць візіту адпавядае нядаўняму візіту ў Кітай. Наколькі сур'ёзныя чаканні мы можам мець для Беларусі ад яго правядзення?

Перш за ўсё, важна мець на ўвазе, што празмерных чаканняў быць не павінна. Калі Кітай знаходзіцца на першым месцы ў свеце па памеры эканомікі, то ў Пакістана толькі 25 месца. Сусед краіны ў рэйтынгу па памеры эканомікі — Польшча, што таксама з'яўляецца пэўным арыенцірам для вызначэння патэнцыялу супрацоўніцтва. Але з геаграфічнага пункту гледжання мы не можам мець тавараабарот з Пакістанам, роўны польскаму (1848 мільёнаў долараў за 2015 год) з-за таго, што Польшча мяжуе з Беларуссю, а Пакістан размешчаны ў Паўднёвай Азіі за тысячы кіламетраў. Пры гэтым камунікацыі не самыя выгодныя для нас — марскі шлях для ажыццяўлення тавараабароту з'яўляецца нязручным, а сухапутны вельмі дорага абыходзіцца, істотна абмяжоўваючы спектр беларускіх тавараў, якія выгадна будзе туды пастаўляць з улікам выдаткаў на перавозку. Падобныя праблемы ў развіцці гандлю з Беларуссю і ў Пакістана, у сілу чаго тавараабарот з гэтай краінай склаў па выніках мінулага года толькі крыху больш за 56 мільёнаў долараў.

Падобная сітуацыя і па інвестыцыйным патэнцыяле. Калі Кітай за апошнія дзесяць гадоў у дзесяць разоў павялічыў аб'ём інвестыцый за свае межы, стаўшы трэцім найбуйнейшым інвестарам на планеце, то Пакістан практычна невядомы як сур'ёзны гулец на рынку замежных інвестыцый. Таму мы не можам чакаць патэнцыйных інвестыцыйных пагадненняў для беларускай эканомікі на мільярды долараў, што ўжо стала звыклым па выніках візітаў кіраўніка дзяржавы ў Кітай.

У плане тэхналагічных магчымасцяў сітуацыя яшчэ больш адрозніваецца. У адносінах з Кітаем Беларусь у асноўным чакае **паступлення сучасных кітайскіх тэхналогій на вытворчасці, якія ствараюцца ў Беларусі**. Зваротны паток таксама ёсць, але магчымасці дзвюх краін несупастаўныя. Улічваючы, што ў Кітай за апошнія дзесяцігоддзі ўкаранёны дзясяткі тысяч сучасных заходніх тэхналогій, а інжынерны корпус, які імкліва расце, вынаходзіць ужо новыя тэхналогіі на кітайскай зямлі на базе заходніх, Кітаю ёсць што прапанаваць Беларусі. У адносінах з Пакістанам сітуацыя адваротная. Пакістан не з'яўляецца цэнтрам прыцягнення замежных сучасных тэхналогій і буйным тэхналагічным цэнтрам. Тут ужо гаворка ідзе пра магчымасці для Беларусі прапанаваць свае тэхналогіі для ўкаранення ў пакістанскую эканоміку. Гэта важна для беларускай эканомікі, паколькі ў большасці такіх выпадкаў гаворка ідзе пра зборачныя цэхі, у якіх з беларускіх камплектуючых могуць збірацца гатовыя вырабы для пакістанскай эканомікі. На пакістанскім рынку ўжо з мінулага года можна купіць сабраныя ў краіне беларускія трактары. У будучыні такія магчымасці могуць быць цікавыя для Мінскага аўтамабільнага завода і Амкадора, якія ўжо робяць крокі па асваенні пакістанскага рынку. Яшчэ да візіту беларускага Прэзідэнта ў Мінску 22 верасня адбылася сустрэча з урадавай дэлегацыяй правінцыі Пенджаб, на якой прадстаўнікі гэтых прадпрыемстваў абмяркоўвалі з пакістанскім бокам падобныя перспектывы.

Якія фактары дазваляюць разлічваць на пазітыў у развіцці адносін, нягледзячы на шэраг названых негатыўных аспектаў? Галоўным фактарам выступае непадробная ўзаемная цікавасць у развіцці ўсё больш прадуктыўнага супрацоўніцтва. Так, 7—8 верасня ў Брэсце прайшло ўжо трэцяе па ліку пасяджэнне сумеснай беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, вынікі якога прадэманстравалі існуючыя магчымасці. У прыватнасці, пакістанскі бок прапанаваў сур'ёзна працаваць над арганізацыяй прамых авіязносін з Беларуссю і новых лагістычных маршрутаў для кантэйнерных перавозак паміж дзвюма краінамі. Улічваючы, што першае пасяджэнне сумеснай беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве адбылося толькі 7 жніўня 2015 года, відавочная дэманстрацыя волі бакоў да інтэнсіўнага нарошчвання кантактаў.

У наяўнасці і імклівы рост палітычнай кааперацыі. Гэта ўжо другі візіт беларускага Прэзідэнта ў Пакістан за два гады, што само па сабе гаворыць пра многае.

У цэлым, нягледзячы на існуючыя абмежаванні ў развіцці адносін, Пакістан з'яўляецца адным з тых буйных рынкаў, якія знаходзяцца далёка ад еўрапейскага рэгіёна і зведваюць зараз сур'ёзныя праблемы. Нізкія тэмпы развіцця Еўрасаюза, падзенне расійскай і ўкраінскай эканомік, якое зацягнулася, прымушаюць беларускіх экспарцёраў шукаць новыя магчымасці на раней нязвыклых маршрутах. І Паўднёвая Азія ў цэлым, а Пакістан у прыватнасці, не могуць быць упушчаны пры такім раскладзе.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.

■ Патэнцыял

СУДНАХОДСТВА РАЗАМ З ПОЛЬШЧАЙ

Гэты тыдзень праходзіць пад маркай «транспартны»

Учора пачаўся X Беларускі транспартна-лагістычны кангрэс і адкрылася выстаўка «Транспарт і лагістыка — 2016». Да гэтага сёлетнія замежныя госці адкрыцця — міністры з Польшчы — паспелі правесці шэраг двухбаковых сустрэч, па выніку якіх дамовіліся развіваць беларуска-польскае супрацоўніцтва ў суднаходстве і прымежнай інфраструктуры.

Па словах **Анатоля КАЛІНІНА, намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**, беларускі транспартны тыдзень стаў міжнароднай пляцоўкай, на якой адбываецца абмен вопытам, абмяркоўваюцца планы на будучыню і ствараюцца новыя стратэгіі развіцця лагістыкі. «Наша рэспубліка знаходзіцца на мяжы двух найбольш буйных інтэграцыйных аб'яднанняў — Еўрапейскага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў, з'яўляецца скрыжаваннем міжнародных транспартных шляхоў. Таму для нас важна выкарыстанне найлепшых сусветных практык нарошчвання міжнародных пасажырскіх і грузавых патокаў», — адзначыў ён.

Анатоль Калінін выказаў надзею, што па выніках кангрэсу будуць знойдзены новыя метады кіравання транспартам і лагістыкай, а галоўнае — працягнуць фарміравацца партнёрскія адносіны паміж бізнесам і дзяржавай. «Транспарт з'яўляецца найважнейшым складнікам росту эканомікі, таму ўрадам нашай краіны дадзенай сферы ўдзяляецца значная ўвага», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Выстаўка «Транспарт і лагістыка — 2016» размясцілася ў мінскім Футбольным манежы. У ёй узялі ўдзел каля 70 арганізацый з 9 краін свету. Сярод задзейнічаных — транспартна-лагістычныя цэнтры, вытворцы і дылеры аўтатэхнікі, пастаўшчыкі абсталявання для аснашчэння лагістычных цэнтраў, страхавыя кампаніі, адміністрацыі марскіх партоў і кіравання чыгунак з СНД, блізкага і далёкага замежжа.

Ад разнастайнасці стэндаў на выстаўцы разбягаюцца вочы, аднак адразу прыцягвае ўвагу пляцоўка, арганізаваная Беларускай чыгункай. **Ігар АДЛІГА, начальнік службы інфармацыйных тэхналогій чыгункі**, трымае ў руках мадэль электроннай пломбы. «Наша інавацыя, — тлумачыць ён, — гэта новая тэхналогія электроннай пломбы. Яе выкарыстанне дапамагае як паскараць працэс камерцыйнага агляду грузу, так і спрашчаць працэдуры, звязаныя з праходжаннем мытні. Зараз яна праходзіць тэсціраванне». Па яго словах, такая электронная пломба можа выкарыстоўвацца перавозчыкамі ці ўладальнікамі грузаў. Яе аналагі існуюць і ў іншых краінах свету. Распрацоўка беларускай кампаніі «Наваком» каштуе ў дзесяць разоў танней за імпартныя, але не саступае па якасных характарыстыках.

На адкрыцці мерапрыемства таксама прысутнічалі і замежныя госці: міністр зносін Латвійскай Рэспублікі Улдзіс Аўгуліс, а таксама міністры з Польшчы, які паспелі правесці перамовы з айчынным міністэрствам транспарту і камунікацый. Па яго выніках было вырашана развіваць суднаходства паміж Беларуссю і Польшчай. Адпаведны мемарандум аб супрацоўніцтве ў галіне аднаўлення воднага шляху Е40 на ўчастку Днепр-Вісла падпісалі **міністр транспарту і камунікацый Беларусі Анатоль СІВАК** і **міністр марской гаспадаркі і рачнога суднаходства Польшчы Марэк ГРУБАРЧЫК**.

Фота БЕЛТА.

На выставе.

«Польшча і польская транспартная сістэма, транспартнае ведамства — нашы асноўныя партнёры ў плане развіцця транзіту», — заявіў Анатоль Сівак. Па яго словах, рост транзітных перавозак за восем месяцаў гэтага года склаў 13%. Пры гэтым найбольш актыўна развіваюцца кантэйнерныя перавозкі. Яны выраслі амаль у два разы ў параўнанні з мінулым годам у перыяд са студзеня па жнівень (напрамак з Кітая ў Еўропу і з Еўропы ў Кітай) — да 75 тысяч кантэйнераў.

Таксама бакі абмеркавалі пытанні развіцця пагранпераходаў, утрымання, рэканструкцыі аўтамабільных, чыгуначных масткоў. Быў падпісаны адпаведны мемарандум аб узаемаразуменні і паглыбленні супрацоўніцтва ў галіне чыгуначнага, аўтамабільнага і авіятранспарту. У хуткім часе плануецца падпісаць пагадненне аб будаўніцтве новага аўтадарожнага моста. «Мы ўзгаднілі свае планы развіцця інфраструктуры II Агульнаеўрапейскага транспартнага калідора (Берлін — Познань — Варшава — Брэст — Мінск — Смаленск — Масква — Ніжні Ноўгарад. — **«Звязда»**). Таксама было расказана аб інтарэсе беларускіх экспартных прадпрыемстваў да польскіх партоў. Былі выказаны элементы, якія дазваляюць далей аб'ядноўваць інфраструктуру з гэтым праектам. Гэта палепшыць сувязь з поўднем Еўропы», — дадаў міністр транспарту і камунікацый.

Міністр інфраструктуры і будаўніцтва Польшчы Анджэй АДАМЧЫК адзначыў, што развіццё транспартнай інфраструктуры ўсіх тыпаў — авія-, аўтадарожнай, чыгуначнай — вельмі важнае для абедзвюх краін, і назваў яе «рухавіком прагрэсу». «Мы хочам быць канкурэнтаздольнымі ў Еўропе, а для гэтага неабходна супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю», — падкрэсліў ён. У сваю чаргу, Марэк Грубарчык заявіў, што «пачаўся новы этап адносін паміж Беларуссю і Польшчай». Перш за ўсё — гэта пытанне ўз'яднання Варшавы і Брэста (Е-40) водным шляхам і выкарыстання польскіх партоў. Ужо створана спецыяльная працоўная група. «І дадатковы аргумент у развіцці гэтага кірунку: з пункту гледжання ўздзеяння на навакольнае асяроддзе гэта найбольш экалагічны від транспарту», — лічыць міністр марской гаспадаркі і рачнога суднаходства Польшчы.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

Справа Скарыны жыве ў «Скарыне»

— Дзе вучышся?

— У «Скарыне», — адказваюць маладыя людзі ў Гомелі, калі заходзіць размова пра адукацыю. Зразумела ж, тыя, хто мае гонар атрымліваць веды ў ГДУ імя Францыска Скарыны. Усіх першакурснікаў тут абавязкова прыводзяць у музей, прысвечаны самаму першаму прапагандысту беларускай мовы.

Чвэрць стагоддзя таму ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце адкрыўся музей-лабараторыя Францыска Скарыны. Дарэчы, адбылося гэта менавіта пасля таго, як сам універсітэт стаў насіць імя першадрукара. З таго часу і па сённяшні дзень музей узначальвае **Канстанцін УСОВІЧ.** Акрамя правядзення экскурсій і работы з экспанатамі, колькасць якіх сёння перавышае 500, ён займаецца складаннем слоўнікаў і хрэстаматый.

«Мы адзіная вышэйшая навучальная ўстанова ў свеце, якая носіць імя Францыска Скарыны».

Скарына ў музейным пакоі паўсюль. Ён загадкава глядзіць са шматлікіх партрэтаў, з вокладак кніг, яго выявы графічныя і жывапісныя, тканыя і драўляныя... Такім розным яго ўяўлялі мастакі. Між тым налета спаўняецца 500 гадоў, як у Празе Францыск Скарына надрукаваў першую кнігу Бібліі — Псалтыр на тагачаснай беларускай мове. Дакладна, гэта адбылося 6 жніўня 1517 года, нагадвае Канстанцін Сяргеевіч:

— У сённяшняй сталіцы Чэхіі да 1519 года наш першадрукар выдаў 23 перакладзеныя і добра ілюстраваныя кнігі Бібліі. Потым у Вільні каля 1522 года яшчэ адну — «Малую падарожную кніжыцу». Праз тры гады яшчэ адну — «Апостал», таксама ў Вільні. Наш музей ва ўніверсітэце з'явіўся дзякуючы ініцыятыве колішняга загадчыка кафедры беларускай мовы, доктара філалагічных навук, прафесара Уладзіміра Анічэнкі. Ён выкладаў гісторыю роднай мовы і захапляўся асобай Францыска Скарыны. У 1988 годзе ён звярнуўся да тагачаснага рэктара ўніверсітэта Барыса Бокуця з прапановай прысвоіць імя Скарыны нашаму ўніверсітэту. Потым рэктарат і парткам універсітэта накіравалі ў Гомельскі абкам партыі хадатайніцтва. Адпаведна абкам КПСС хадайнічаў перад Саўмінам БССР. Аднак з першай спробы гэта не атрымалася. Бо палічылі, што Францыск Скарына ў значнай ступені рэлігійны дзеяч. Кіраўніцтву ўніверсітэта было сказана, што ўстанова яшчэ не гатовая да прысваення імя Францыска Скарыны. Праз пэўны час былі арганізаваны на факультэтах сходы ў студэнцкіх групах і на кафедрах. Да таго ж у адзеле навукі абкама партыі працаваў выпускнік нашага ўніверсітэта Мікалай Воінаў. Ён напісаў станоўчую даведку, аб'ектыўна ацаніў значнасць Францыска Скарыны ў гісторыі беларускай культуры і 29 лістапада 1988 года Савет Міністраў БССР прысвоіў нашаму ўніверсітэту імя Францыска Скарыны. У гэты ж час пачала стварацца і музейная экспазіцыя.

— З чаго яна пачыналася?

— Грамадскі і культурны дзеяч, гісторык, мастацтвазнаўца, педагог, калекцыянер Анатоль Яфімавіч Белы перадаў у дар Гомельскаму ўніверсітэту сваю вялікую калекцыю мастацкіх твораў, прысвечаных Францыску Скарыну. У яе ўваходзілі творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, навуковая літаратура, копіі артыкулаў з эмігранцкіх выданняў... Гэтыя экспанаты і сёння займаюць пераважнае месца ў музеі. Пазней з'явілася карціна Пётры Сергіевіча «Францыск Скарына ў друкарні», напісаная ў 1957 годзе. Яна спачатку знаходзілася ў бібліятэцы Дома літаратара ў Мінску. Адтуль яе перадалі нам у сярэдзіне 90-х. Цяпер яна знаходзіцца ў чытальнай зале нашай універсітэцкай бібліятэкі. У экспазіцыі ёсць драўляная выява першадрукара аўтарства скульптара Эдуарда Астаф'ева, якую ён падарыў нашаму музею. Дарэчы, гэтаму садзейнічаў былы старшыня Гомельскага аблвыканкама Мікалай Вайцянкоў — у той час, калі быў паслом у Празе. Ён жа ініцыяваў усталяванне там помніка Францыску Скарыну ў 1996 годзе.

— Францыска Скарыну сваім лічаць не толькі ў Беларусі...

— Даследчыкі мяркуюць, што Скарына ў Кракаве вучыўся з 1504-га па 1506 год — у знакамітай Ягелонскай акадэміі. Ён закончыў факультэт вольных мастацтваў са ступенню бакалаўра, а пазней атрымаў званне ліцэнцыята медыцыны і ступень доктара вольных мастацтваў. Пасля яшчэ пяць гадоў вучыўся на факультэце медыцыны, верагодна, нейкага еўрапейскага ўніверсітэта. Ну а ступень доктара медыцыны абараніў ужо ў 1512 годзе ў італьянскай Падуі. Там ён паспяхова здаў іспыты ва ўніверсітэце. У Кракаве і Падуі засталіся дакументы, якія сведчаць пра адукацыю Скарыны. Да таго ж, у 1949 годзе ў Падуанскім універсітэце была створана мемарыяльная зала, дзе сярод сарака партрэтаў самых знакамітых выпускнікоў ёсць і выява Францыска Скарыны.

— Якім чынам праца Францыска Скарыны актуальная сёння?

— Асноўныя асаблівасці сучаснай беларускай мовы — не ўсе, але многія існавалі ўжо ў час Скарыны. У перакладах, прадмовах і пасляслоўях Скарына актыўна выкарыстоўвае сінтаксічныя, граматычныя і лексічныя сродкі тагачаснай беларускай мовы. Францыск Скарына зрабіў беларускую мову мовай кнігадрукавання і дзякуючы гэтаму станавілася ўсё больш адукаваных людзей. Па сутнасці, ён стварыў падставы для з'яўлення беларускіх пісьменнікаў. Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Афанасій Філіповіч, Сімяон Полацкі і іншыя пісьменнікі і грамадскія дзеячы, вучоныя і асветнікі вучыліся на кнігах Скарыны. Ён хацеў, каб кнігі былі як мага больш запатрабаваныя. Менавіта таму друкаваў іх не на лацінскай, польскай або чэшскай мовах, а на старабеларускай. Да таго ж у той час пісьменнасці вучыліся выключна па Бібліі, бо спецыяльных падручнікаў не было. Даследчыкі сцвярджаюць, што гравюры ён сам вырабляў. Хутчэй за ўсё менавіта ён таксама перакладаў тэкст. Для гэтага Скарына выкарыстоўваў арыгіналы на старажытнаяўрэйскай, лацінскай, нямецкай, чэшскай і грэчаскай мовах. Іншыя спецыфічныя віды работ рабілі яго памагатыя. Але ж самае галоўнае — ён арганізаваў друкаванне кніг.

«Францыск Скарына зрабіў беларускую мову мовай кнігадрукавання і дзякуючы гэтаму станавілася ўсё больш адукаваных людзей».

— Як сёння развіваецца музей Францыска Скарыны?

— Мы адзіная вышэйшая навучальная ўстанова ў свеце, якая носіць імя Францыска Скарыны. У нас ёсць навуковая і мастацкая канцэпцыі стварэння новага музея першадрукара на базе ўніверсітэта. Не хапае толькі сродкаў і памяшкання. У новай экспазіцыі было б добра ўсталяваць дзеючы макет старажытнай друкарні. Паказаць гарады, у якіх Францыск Скарына жыў і працаваў, адлюстраваць дзейнасць яго знакамітых сучаснікаў. Дарэчы, мы збіраем матэрыялы не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Напрыклад, пра ўсіх узнагароджаных ордэнам і медалём імя Францыска Скарыны, пра помнікі, якія ўсталяваны яму ў свеце...

— Вы ж, Канстанцін Сяргеевіч, займаецеся і больш шырокай навуковай тэматыкай...

— Так, у суаўтарстве з намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесем Сушам заканчваем поўную хрэстаматыю паэзіі пра Францыска Скарыну. Таксама да 500-годдзя ўсходнеславянскага кнігадрукавання рыхтуем хрэстаматыю паэзіі пра беларускую мову. Яна будзе ўключаць партрэты, кароткія біяграфіі 250 айчынных паэтаў і ўрыўкі з іх твораў, у якіх паказваецца прыгажосць і асвятляюцца пытанні беларускай мовы. Самы першы верш у ёй — аўтарства Францыска Скарыны. Гэты паэтычны летапіс ахоплівае 500-гадовы перыяд развіцця беларускай мовы. Кніга ў двух тамах выйдзе ў Выдавецкім доме «Звязда». Яна адрасуецца вучням старэйшых класаў і настаўнікам сярэдніх агульнаадукацыйных школ, навучэнцам гімназій і каледжаў, студэнтам ВНУ, выкладчыкам, вучоным і ўсім прыхільнікам беларускай мовы. Акрамя таго, у суаўтарстве з Уладзімірам Пашуком падыходзіць да завяршэння праца над «Беларускім слоўнікам па эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай геаграфіі», які ўтрымлівае больш чым 1300 адпаведных тэрмінаў. «Вялікі практычны беларуска-рускі агульнаэканамічны слоўнік», які плануецца выдаць налета, утрымлівае больш чым 160 тысяч пар найбольш ужывальных у эканоміцы слоў, словазлучэнняў і тэрмінаў сучасных беларускай і рускай літаратурных моў. Ён можа стаць своеасаблівай базай для пераводу дзяржаўнага справаводства на беларускую мову і наогул для дзейнасці дзяржаўнага апарату на беларускай мове.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

Выбраць прафесію, хобі ці «няню на гадзіну»...

...ДАПАМОГУЦЬ У НОВЫМ СЯМЕЙНЫМ ЦЭНТРЫ

Стары двухпавярховік, што дажываў апошнія дні, ператварыўся ў мадэрновы будынак з часткова шклянымі сценамі, трыма паверхамі і выхадам на летнюю тэрасу. На рэалізацыю праекта спатрэбілася 14 гадоў. І цяпер будынак перададзены Мінскаму гарадскому цэнтру сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.

Сямейны цэнтр, як ласкава пачалі называць яго ўсе, хто меў дачыненне да праекта, — вынік сумеснай работы рэспубліканскага дабрачыннага грамадскага аб'яднання (РДГА) «Клуб ільвоў», спонсарскіх Лайанз-клубаў каралеўстваў Нарвегіі, Даніі, Швецыі, рэспублік Ісландыі і Фінляндыі пры актыўным удзеле Цэнтра і камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

— Работа тут будзе перш за ўсё скіравана на дзяцей і тых мінчан, якім спатрэбіцца падтрымка. Думаю, што нашы намаганні і дапамога замежных сяброў праявяцца і ў іншых сумесных праектах, — выказала надзею **Жанна РАМАНОВІЧ, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама падчас урачыстага адкрыцця.**

— Стварэнне новага будынка сямейнага цэнтра — гэта сапраўды знакавая з'ява. Аказанне дапамогі і падтрымкі сем'ям у нашай дзяржаве — гэта будучыня сур'ёзныя дывідэнды, бо моцная і здаровая сям'я — гэта паспяховая сям'я, дзе кожны можа раскрыць свае творчыя магчымасці, — выказаўся **Вячаслаў ШЧЭРБА, старшыня РДГА «Клуб ільвоў» (LC «Minsk-Central»),** паабяцаўшы далейшую міжнародную падтрымку з боку клубаў ільвоў.

Урачыстае адкрыццё сямейнага цэнтра і песенна-танцавальныя віншаванні.

Каб справай падтрымаць абяцанне не пакідаць рэалізаваны праект, прадстаўнікі міжнародных клубаў ільвоў, або як яны самі называюць сябе — сям'і Лайанз, пасадзілі каля агароджы сямейнага цэнтра алею Клуба ільвоў.

— Гэта вельмі важны праект, значны і адметны будынак, выдатны прыклад таго, як аб'ядналіся валанцёры, афіцыйныя ўлады, неабыякавыя людзі з многіх краін. Ён, спадзяюся, будзе доўгія гады прыносіць карысць беларускім сем'ям, — выказалася **Гудрун ІНГВАДОЦЦІР, другі міжнародны віцэ-прэзідэнт «Лайанз Клабс Інтэрнэшнл».**

У хуткім часе ў сямейны цэнтр давязецца абсталяванне і мэбля і распачнецца паўнавартасная работа. Пакуль жа тут дзейнічаюць толькі некалькі гурткоў. У тым ліку гурток «Крэатыўны малеча», дзе мамы сумесна з дзецьмі займаюцца арт-тэрапіяй. «У нас няма катэгорый і адзнак, няма шаблонаў работы. Дзіця можа выразіць сябе, і наша задача, каб маці ўбачыла моцныя бакі малога, яго патэнцыял», — расказалі супрацоўнікі цэнтра.

Адна з паслуг цэнтра — кансультаванне па прафесійнай арыентацыі. Тут можна вызначыцца, кім стаць, прайшоўшы тэсціраванне на спецыяльнай праграме і атрымаўшы прафесіяграмы, а таксама прайсці прафдыягностыку на спецыяльныя здольнасці. Падлеткі могуць прыйсці сюды з бацькамі, а псіхолаг дасць пэўныя рэкамендацыі. *«Людзі больш сталага ўзросту таксама могуць наведаць нас, каб вызначыцца з хобі»,* — дадала спецыяліст цэнтра.

— У нас таксама будзе рэалізавана такая запатрабаваная паслуга, як «нянька на гадзіну». Сярод дзяржаўных устаноў мы першыя зможам цяпер паўнавартасна аказваць яе, — расказала **Кацярына МАЛЬЦАВА, дырэктар Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.** *— Здараецца, што маці проста няма з кім пакінуць дзіця, калі ёй неабходна адысці па сваіх справах, нават у тую ж паліклініку. З нашай дапамогай яна зможа атрымаць да трох вольных гадзін, падчас якіх з малым будзе працаваць спецыяліст. Час, праведзены з нянькай, разлічаны не толькі на гульню, але і на работу з псіхолагам і, па жаданні мамы, на дыягностыку дзіцяці.*

Менавіта яго кіраўніцтва на працягу доўгага адрэзка часу пісала лісты ў вышэйстаячыя органы з просьбай аб пакупцы адпаведнай тэхнікі. Але адказы сведчылі, што пакуль атрымаць фінансаванне праблематычна. І вось спецыялісты «Камунальніка» рашылі пайсці, як той казаў, іншым шляхам. А дакладней, паўдзельнічаць у конкурсе праектаў, што праводзіцца пад агульнай назвай «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай эканомікі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца пастаянным прадстаўніцтвам Праграмы развіцця ААН у Беларусі. Падрыхтавалі апісанне сваіх намераў, а таксама бізнес-план. Апошні абаранялі спачатку ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Як потым скажа **намеснік міністра Ія МАЛКІНА,** брастаўчанам проста паверылі на слова. І яны не падвялі. Такім чынам брэсцкае прадпрыемства ў студзені 2015 года стала адным з пераможцаў конкурсу праектаў. І напрыканцы мінулага тыдня ў мікрараёне Паўднёвы адбылося ўрачыстае адкрыццё комплексу па перапрацоўцы драўняных адходаў у біяпаліва.

Толькі вось традыцыйнай чырвонай стужкі не было на памянёным мерапрыемстве, пераразалі стужку... зялёную, каб яшчэ раз падкрэсліць, што вось гэтыя цудоўныя агрэгаты стануць маленькім унёскам у вялікую будучую «зялёную эканоміку» нашай краіны.

Усе прысутныя прэзентацыі сталі сведкамі работы новага комплексу. На пляцоўцы загадзя падрыхтавалі цэлую гару астаткаў дрэў. Спачатку пень з карэннем ад вялізнага дрэва літаральна перакусвае на кавалкі мабільная колавая драбільная ўстаноўка. Потым адмысловы пагрузчык падае кавалкі драўніны на спецыяльны агрэгат, які ператварае іх у дробную стружку. Вось гэты канечны прадукт і ёсць біяпаліва, якое пойдзе на кацельныя ЖКГ, часткова будзе рэалізоўвацца. Варта сказаць, што кожная з машын мае дадатковы камплект абсталявання. Таму пагрузчык лёгка спраўляецца з падачай любой сыравіны, напрыклад былых акон, дзвярэй, шаф і буфетаў. Прытым, паводле слоў работнікаў, у машыне ёсць дэталі, якія ўлоўліваюць метал. Такім чынам балты, шрубы, петлі і іншая фурнітура з мэблі ў дрэўнае паліва не трапляюць. Гаспадары новага комплексу сказалі, што яго магутнасці хопіць, каб ператварыць у карысную субстанцыю 50 тысяч кубаметраў драўняных адходаў штогод.

«Камунальніку» разам з гарадскім бюджэтам гэты праект абышоўся ў 125 тысяч рублёў. Столькі каштавала падрыхтоўка пляцоўкі і пераабсталяванне некаторых агрэгатаў. А набыццё машын еўрапейскай вытворчасці, якія і будуць перапрацоўваць адходы, прафінансаваў Еўрасаюз. **Намеснік кіраўніка прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Джым КАЗЕНС** сказаў, што ганарыцца сваім удзелам у названым праекце. Варта адзначыць, што ёсць чым ганарыцца. Кошт тэхнікі, якая цяпер будзе працаваць у Брэсце, складае паўмільёна еўра.

Рабочыя, што прадэманстравалі прысутным бездакорную работу машын і агрэгатаў, ужо асвоіліся з новай тэхнікай. **Дырэктар «Камунальніка» Вадзім КУШНЯРУК** сказаў, што з уводам у строй комплексу створана шэсць новых рабочых месцаў. Ія Малкіна падкрэсліла адну з асаблівасцяў пераходу на «зялёную эканоміку»: разам з паляпшэннем экалогіі дабаўляюцца новыя рабочыя месцы.

Аб эканоміцы і экалогіі гаварылі пасля ўрачыстага адкрыцця на прэс-брыфінгу. Зроблены маленькі крок да паляпшэння стану навакольнага асяроддзя ў адным горадзе краіны. Але такія крокі надта важныя. Бо калі мы паляпшаем экалогію, гэта станоўча адбіваецца на здароўі кожнага з нас. І зноў прагучала, можа крыху рэзка і катэгарычна, але па сутнасці правільна: «Калі мы не паменяем свае адносіны да навакольнага асяроддзя, планета проста загіне». Можна дадаць, што маецца на ўвазе глабальны маштаб праблемы. Ды тая самая глабальнасць складваецца з кожнага берага самай малой рачулкі, узлеску ўздоўж дарогі, поля за вёскай. А што мы маем? Рэкі і берагі літаральна завалены пластыкам. Кожны год ладзяцца шматлікія дэсанты валанцёраў, моладзі, школьнікаў па прыборцы, але прыбраць, на жаль, удаецца не ўсё. На прыборку лесу трацяцца вялікія сродкі, а маглі б пайсці тыя грошы на арганізацыю новых экалагічных сцяжын і месцаў адпачынку. Пра стыхійныя звалкі ў самых нечаканых месцах ужо не кажу, бо надакучыла. Вось вам і галоўны рэзерв «зялёнай эканомікі», глабальнага паляпшэння экалогіі і разам з тым здароўя людзей, які можа быць задзейнічаны пры ўмове перамены адносін да навакольнага асяроддзя. Ну і канкрэтныя эканамічныя праекты, накшталт рэалізаванага ў Брэсце, выглядаюць своечасовымі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Да лекараў без талонаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Прыдзвінскім краі, у тым ліку ў глыбінцы, расце колькасць сучасных спартыўных залаў. Выдатны фізкультурна-аздараўленчы цэнтр разам з басейнам цяпер ёсць у Шуміліне. Днямі ў Сянно будзе прэзентаваны комплекс для заняткаў фізкультурай і спортам. У Гарадку ёсць лыжароллерная траса і будуецца басейн.

Дзякуючы інфраструктуры і напружаным трэніроўкам прадстаўнікі Віцебшчыны дасягнулі выдатных поспехаў на мінулых Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульнях.

З Францыі па... беларускія п'яўкі

Наведвальнікі выставы змаглі атрымаць уяўленне аб шырокім спектры прадукцыі і паслуг, якія спрыяюць здароваму ладу жыцця. Супрацоўнікі медыцынскіх установ прадставілі новыя тэхналогіі і сучасныя падыходы ў прафілактыцы і лячэнні розных захворванняў.

— У нашым «арсенале» самае сучаснае абсталяванне для дыягностыкі. Вядзецца актыўнае ўкараненне высокатэхналагічных метадаў, — расказаў **галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага цэнтра дэрматавенералогіі і касметалогіі Віктар СПІРЫДОНАЎ.** — Цэнтр вядомы далёка за межамі вобласці і немедыкаментозным лячэннем. Дарэчы, за гэты кірунак дзейнасці Міжнародны Сакратаўскі Камітэт, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Оксфардзе, прысудзіў нам медаль.

Сярод пацыентаў цэнтра расце колькасць іншаземцаў. Напрыклад, з Францыі жанчына адмыслова прыехала ў Віцебск, каб лячыцца п'яўкамі. Падобныя метады лячэння могуць быць эфектыўнымі, напрыклад, пры лячэнні хранічнага дэрматозу... Медыкі выкарыстоўваюць таксама біяполе пчол, масаж гарачымі камянямі, «рыбную тэрапію», шакаладнае абгортванне, «жывую» і «мёртвую» ваду і падобнае.

— Але мы даём пацыенту права выбару: выкарыстоўваць пры лячэнні звыклыя метады або іншыя... Вядзём анлайн-кансультаванне. Актыўна карыстаемся тэлемедыцынай, што вельмі важна для вызначэння дыягназаў і лячэння жыхароў глыбінкі, — дадаў кіраўнік медыцынскага цэнтра.

Вулічныя трэнажоры — шлях да сэрца дзяўчыны.

Дарэчы, у цэнтры першымі ўкаранілі практыку ацэнкі якасці абслугоўвання пацыентаў. На электронным абсталяванні наведвальнік ставіць балы ўрачу. І апошні, калі хворы задаволены, атрымлівае грашовую прыбаўку.

Піце, людзі, ацыдафілін

Наведвальнікаў выставы вабіла і магчымасць дэгуставаць прадукты. Многія вытворцы прадавалі мясныя, малочныя вырабы па прывабных цэнах.

Былі і навінкі. Ацыдафілін аднаго з мясцовых прадпрыемстваў у крамах з'явіўся менш чым два тыдні таму. Разам з тым ужо наладжаны экспарт у Расію карысная кісламалочнага прадукту. Ён вырабляецца шляхам сквашвання пастэрызаванага каровінага малака пры дапамозе адмысловых бактэрый (ацыдафільная палачка, кефірныя грыбкі, малочнакіслыя стрэптакокі). Між іншым, яго вытворчасць упершыню наладзілі ў СССР. Некаторыя краіны былога сацыялістычнага лагера таксама займаюцца яго вырабам. Як растлумачылі прадстаўнікі прадпрыемства, ацыдафілін засвойваецца арганізмам значна лепш, чым малако. Гэта адбываецца за кошт ферментацыі лактозы. Таму ацыдафілін выкарыстоўваюць у лячэбным і дыетычным харчаванні, у тым ліку для дзятвы.

На выставе смачнымі вегетарыянскімі стравамі і кактэйлямі частавалі актывісты грамадскай арганізацыі «Доброе сердце». Штаб-кватэра яе знаходзіцца ў Віцебску.

— Я прытрымліваюся здаровага ладу жыцця. З людзьмі хачу падзяліцца асабістым вопытам, тым, што дасягнула. Я па адукацыі — інжынер і псіхолог. Мы пастаянна ўдзельнічаем у гэтай выставе. Шчыра радуюся, калі людзі, напрыклад, кідаюць курыць з нашай дапамогай. Праводзім ананімныя заняткі для залежных ад тытуню, спіртнога, наркотыкаў, — расказала **старшыня Тамара АСТРОЎСКАЯ.**

За год выкурваю... бервяно

Кожны ахвотны змог аформіць на форуме пашпарт здароўя, прайшоўшы абследаванне на месцы: ЭКГ, артэрыяльны ціск і іншае. Свае паслугі рэкламавалі санаторна-аздараўленчыя і турыстычныя арганізацыі.

Прыхільнік здаровага ладу жыцця, **кіраўнік рэабілітацыйнага цэнтра Віталь ШАБЛОЎСКІ** з першага погляду вызначаў у натоўпе заядлых курцоў:

— Гэта відаць па колеры скуры і стане зубоў. Нават магу прыкладна сказаць, колькі гадоў чалавек залежны ад тытуню. Я сам калісьці курыў: пачак штодня і больш. Вы пад два?...

«Дабіў», калі паказаў вялікую надзіманую цыгарэту вышынёй з пяцікласніка. Яна сваімі памерамі вельмі нагадвала бервяно. Столькі выкурвае чалавек за год — калі яму хапае пачка на дзень.

Каб пазбавіцца ад такой залежнасці, не абавязкова спатрэбіцца гіпноз або пілюлі. Можна і іголкаўколванне паспрабаваць для пачатку. Было б толькі шчырае жаданне адмовіцца ад цыгарэт. Калі падсумаваць кошт двух пачкаў і памножыць на 365 дзён, то атрымаецца сума, якой хопіць на добры ноўтбук, напрыклад. За пяць гадоў і на патрыманае аўто збярэцца. Калі яшчэ і не піць, то на Канарах адпачываць — як да бабулі ў вёску ездзіць...

Сярод іншагародніх удзельнікаў выставы былі прадстаўнікі інфармацыйнай медыцынскай службы 131.

— Мы добра зарэкамендавалі сабе ў Мінску і цяпер наладжваем сувязі ў рэгіёнах. Людзі актыўна нам тэлефануюць. Набраўшы нумар 131 у будныя дні (з 7 гадзін раніцы да 21.00), можна запісацца бясплатна на кансультацыю да ўрача, на ультрагукавое і іншае абследаванне. Мы параім стаматалагічныя паслугі. У нашай базе — інфармацыя пра аптэкі і наяўнасць лекаў. Можна нават медыцынскае таксі заказаць, — патлумачыла **намеснік дырэктара па медыцынскай часці ААТ «Медыцынская ініцыятыва» Кацярына ЗУБКО.**

Па згаданым тэлефоне можна звярнуцца на «прамую лінію» камітэта аховы здароўя Мінскага гарвыканкама. У планах аналагічны сэрвіс у абласцях краіны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by



Сімвалічная цыгарэта — эквівалент колькасці выкуранага за год тытуню.

■ Лаві момант!

У КАСТРЫЧНІКУ — ЗНІЖКІ НА НЕХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ

Гандлёвыя арганізацыі Мінска ў кастрычніку правядуць для пакупнікоў акцыі «Дні скідак» на нехарчовыя тавары, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Так, ЦУМ «Мінск» 8 і 22 кастрычніка прапануе пакупнікам набыць тавары са зніжкай 17 працэнтаў. Зніжка ў 20 працэнтаў ва ўнівермагу «Беларусь» будзе дзейнічаць 4, 11, 12, 18, 25, 29 кастрычніка. Танней на такую ж суму можна будзе набыць нехарчовыя тавары 13 і 27 кастрычніка ў ГУМе. Таксама 20-працэнтная зніжка будзе дзейнічаць 5, 12, 19 і 26 кастрычніка ў гандлёвым доме «На Нямізе». Танней на 15 працэнтаў будуць тавары ў «Кірмашы» 5, 12, 19 і 26 кастрычніка. Крамы гандлёвага цэнтра «Сталіца» 8 і 22 кастрычніка прапануюць зніжкі ад 5 да 50 працэнтаў. Акрамя таго, «Бліскавіца» 2 кастрычніка будзе гандляваць са зніжкай 15 працэнтаў, крамы «Дамалюкс» 8 і 22 кастрычніка — 15 працэнтаў, «Старт-Х» 5, 12, 19 і 26 кастрычніка — таксама 15 працэнтаў. Гандлёвае прадпрыемства «Паўночніца» 12, 20 і 26 кастрычніка аб'яўляе зніжкі 15 працэнтаў на асобныя групы прамтавараў. «1000 дробязяў» 6, 13, 20 і 27 кастрычніка прапануе зніжку 15 працэнтаў на ўсе тавары, акрамя газавых лічыльнікаў і пліт, «Гаспадар і Гаспадыня» 12 кастрычніка — 20 працэнтаў. «Вераніка» абвясціла 3—7 кастрычніка зніжку 20 працэнтаў на пледы і пакрывалы, 10—14 кастрычніка — 20 працэнтаў на спадніцы, 17—21 кастрычніка — 20 працэнтаў на шторы, 24—28 кастрычніка — 20 працэнтаў на адзенне для цяжарных.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Змена для юных педагогаў...

...пройдзе ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» з 8 па 25 кастрычніка.

Яе ўдзельнікамі стануць навучэнцы профільных педагагічных класаў, лідары школьнага самакіравання, члены грамадскіх аб'яднанняў з высокай вучэбнай паспяховасцю, якія плануюць у будучыні стаць педагогамі. Галоўная мэта праграмы — папулярызацыя педагагічнай прафесіі, развіццё актыўнай жыццёвай пазіцыі і адказных паводзін.

У хлопчыкаў і дзяўчынак будзе магчымасць праявіць сябе ў сацыяльных акцыях, культурна-масавых справах і конкурсах. Прадугледжана і рэалізацыя праектаў, якія прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Таксама плануюцца дзелавыя сустрэчы з рэктарам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, супрацоўнікамі педагагічных сродкаў масавай інфармацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Ну і ну!

МІЛІЦЫЯ ВЫЯВІЛА ПАДЗЕМНЫ... САМАГОННЫ ЦЭХ

Апошнім часам самагоншчыкі-аптавікі з мэтай пазбегнуць адказнасці ўсё больш старанна імкнуцца схаваць свае буйныя незаконныя вытворчасці ад старонніх вачэй.

— На днях да нас па тэлефоне ананімна звярнуўся мужчына з паведамленнем пра тое, што на ўскраіне вёскі Сугвазды Валожынскага раёна з зямлі па начах ідзе дым, чутны нейкія незразумелыя гукі. «Вытворчасць» была надзейна схавана ад вачэй аднавяскоўцаў, нават міліцыянеры, якія выбылі на месца, спачатку не ўбачылі нічога падазронага на ўчастку. Толькі праверыўшы стары склеп, пабудаваны яшчэ «за польскім часам» плошчай больш за 30 квадратных метраў, выявілі вялікую аўтаматызаваную самагонную вытворчасць, якая складалася з 13 металічных ёмістасцяў. Яе ўладальнікам з'яўляецца маладая жанчына, устанаўліваюцца саўдзельнікі супрацьпраўнай дзейнасці, — паведамілі ў **УУС Мінаблвыканкама.**

Па словах гаспадыні, самагон яна гнала «толькі для сябе» пару разоў у месяц, заварваючы «дзесьці па тры мяшкі мукі» (каля 150 кілаграмаў). Аднак нават калі меркаваць па яе словах, то пасля выканання простых арыфметычных дзеянняў атрымліваецца, што гаспадыні з мужам даводзілася выпіваць амаль па 10 літраў самагонкі штодня.

Для дэмантажу цэха задзейнічана некалькі адзінак грузавой тэхнікі, работы працягваліся некалькі гадзін. Па выніках правядзення праверкі матэрыялы будуць перададзеныя ў суд Валожынскага раёна для прыцягнення вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні, звязаныя з незаконным абаротам алкагольных напояў.



Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ПРАВІЛЬНА ЗНЯЦЬ, КАБ ГРАШЫМА НЕ РЫЗЫКАВАЦЬ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Набіраю іншы нумар і трапляю... на тую самую Веру.

— Гэта зноў вы? Прабачце, не магу гаварыць, людзей засяляю, патэлефануйце вечарам.

Вечарам сітуацыя паўтараецца: давайце звяжамся раніцай.

Толькі апоўдні наступнага дня ўдалося «дастукацца» да гаспадыні: «А навошта вы браніруеце кватэру так рана. Набярыце мяне за 10 дзён да патрэбнай даты».

— Колькі хоць будзе каштаваць двухпакаёўка? — дапытваюся ў яе.

— 80 долараў за суткі, — адказвае.

— Навошта ўводзіць людзей у зман: у аб'яве пазначана 35 долараў? — абураюся я.

— На гэта ёсць важкія прычыны, — парыруе жанчына.

Усё стала зразумелым, калі звязалася з Іванам, які прапаноўваў кватэру на праспекце Пераможцаў. Ён пагаджаўся забраніраваць жыллё без папярэдняй аплаты, але загнуў яшчэ большую цану, чым папярэдніца. «Згаджайцеся. Праз два тыдні кошт падымецца. У патрэбным вам раёне ладзіцца семінар. Кватэры паблізу разыдуцца, як гарачыя піражкі», — дадаў ён.

У Арсена кватэра каля станцыі метро «Пушкінская». На патрэбныя мне даты пакуль ніхто яе не заказваў. Але ж надта дорага — 95 долараў. Акрамя таго, ён запатрабаваў аванс. На маё пытанне, дзе гарантыя, што грошы не прападуць, засмяяўся: «А вы можаце пабяцаць, што мяне не падманеце?». Аказалася, што летась хлопец здаў кватэру, на першы погляд, прыстойнаму мужчыну, на адны суткі. Калі на наступны дзень прыехаў па ключ, то ўбачыў дзяўчат. Прадпрымальны чалавек вырашыў падзарабіць — здаў чужую жылплошчу тром студэнткам на працяглы тэрмін.

І іншагароднія знаёмыя, якія часта прыязджаюць у Мінск па справах, пераконвалі, што ўносіць залог за жыллё варта. Аднойчы яны забраніравалі кватэру без папярэдняй частковай аплаты. Прыехалі засяляцца, а там ужо іншыя людзі. Такое здараецца, калі ў Мінску ладзяцца вялікія мерапрыемствы, футбольныя матчы, фестывалі...

Арсену я не дала канкрэтнага адказу. Спадзявалася, што знайду больш выгадны і танны варыянт, аб чым пазней пашкадавала. На календары ўсё менш дзён да семінара, а я яшчэ ў пошуках. На вуліцы Гарадзецкай, як сведчыла аб'ява, здаецца аднапакаёўка за 30 долараў. Пасля званка па ўказаным нумары, мне адказалі, што літаральна сёння туды засяліліся людзі. На наступны дзень мяне патурбавалі з агенцтва, маўляў, вам патрэбна кватэра ва Уруччы? — у нас ёсць тое, што вы шукаеце. Магчыма, я трапіла на пасрэдніка, які здаў мой нумар тэлефона агенцтву. Па наступным адрасе ў мяне папрасілі невялікі аванс за агляд кватэры. А яшчэ, не смейцеся, я ледзьве не зняла жыллё... за мяжой. На здымку рэкламаваліся апартаменты за памяркоўную плату ў Мінску. Але ў інтэрнэце выпадкова наткнулася на знаёмы да болю інтэр'ер. Як сведчыла аб'ява, гэтая кватэра для арэнды прапануецца ў Балгарыі.

І тут я зноў успомніла Веру. Ды тая ўжо павысіла цану да 90 долараў: «Кватэра светлая, толькі што пасля рамонту, ёсць два ложкі, канапа».

— А можна сёння паглядзець ды забраць ключы? — пацікавілася ў яе.

— Там пакуль жывуць людзі. Давайце звяжамся праз тыдзень.

— Але ж мае госці прыязджаюць як раз праз тыдзень, — запанікавала я.

Напярэдадні іх прыезду да ночы прасядзела на тэлефоне. Нейкім цудам удалося выйсці на Юлю, якая прапаноўвала кватэру на вуліцы Мяснікова за 35 долараў. «Заўтра апоўдні жыльцы з'едуць, давайце сустрэнемся каля пад'езда», — абрадавала яна.

Летась ён здаў кватэру, на першы погляд, прыстойнаму мужчыну на адны суткі. Калі на наступны дзень прыехаў па ключ, то ўбачыў... дзяўчат. Прадпрымальны чалавек вырашыў падзарабіць — здаў чужую жылплошчу тром студэнткам.

Але ўсё ж такі закрадваліся сумненні: раптам зноў нічога не атрымаецца?

У 7.15 раніцы наступнага дня сустрэла піцерскіх гасцей. Рэчы здалі ў камеру захоўвання на чыгуначным вакзале. Затым гулялі па горадзе, па плошчы Леніна, зазірнулі ў Чырвоны касцёл. А роўна а 9-й гадзіне пазваніла Юля: кватаранты выслабанілі жылплошчу раней, чым планавалі.

Мы дамовіліся з гаспадыняй аб канкрэтным часе высялення, разлічыліся за пяць дзён пражывання. Дзяўчына папрасіла пакінуць ёй пашпарты, як гарантыю захавання маёмасці. Але кватаранткі не пагадзіліся, дазволілі толькі сфатаграфаваць дакументы на мабільнік. Як раз у гэты момант у мяне зазваніў тэлефон: Вера...

— Дзякуй, але мы знайшлі значна таннейшы варыянт.

— Ды я магу вам здаць кватэру на праспекце Пушкіна за такія ж самыя грошы. А ў Малінаўцы — нават за меншыя. Прыязджайце, я чакаю...

— Дзякуй, але нас задавальняе і гэтая. Нібы ў гасцініцы: свежае мыла, чыстая пасцельная бялізна, беласнежныя ручнікі, тэлевізар, мікрахвалевая печка, інтэрнэт.

Перад Новым годам піцерскія сяброўкі зноў збіраюцца ў Мінск. Для мяне гэта сапраўдны галаўны боль. Перад Калядамі попыт на кватэры павышаецца, адпаведна павялічваюцца і цэны, асабліва на сутачную арэнду. Каб зняць кватэру, трэба браніраваць яе за некалькі тыдняў. Гэтым разам звярнуся ў агенцтва: лепш пераплаціць. Але, як мне параілі разумныя людзі, не варта кідацца ў першую кантору, што трапіць пад руку. Неабходна ўважліва вывучыць водгукі на сайтах. І вядома, аформіць юрыдычныя адносіны, дзе будуць прапісаны абавязкі і правы абодвух бакоў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

КНІГІ З ВЕНЕЦЫІ

Ніяк не мог падумаць венецыянскі выдавец, што кнігі, надрукаваныя ім у 1740 годзе, больш чым праз дзвесце пяцьдзясят гадоў назавуць у Брэсце кантрабандай. Менавіта супрацоўнікі брэсцкай мытні зацікавіліся не зусім звычайным грузам у машыне расіяніна, што ехаў з Заходняй Еўропы праз памежны пераход «Варшаўскі мост».

Было відаць, што кнігі старадаўнія, могуць быць аднесеныя да катэгорыі культурных каштоўнасцяў, таму падлягаюць абавязковаму дэкларацыянаванню, якога грамадзянін не правёў. І кнігі затрымалі да высвятлення.

Як паведамілі ў прэс-групе Брэсцкай мытні, экспертыза ўстанавіла прыкладны год выдання фаліянтаў, кнігі на лацінскай мове выйшлі ў свет у прамежку часу ад 1736 да 1740 года. А выданні, якім больш за 100 гадоў, паводле закона, лічацца культурнымі каштоўнасцямі. Тавар канфіскаваны да рашэння суда.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Краіна здароўя

Выпуск №17 (370)

■ Абарона суставаў

ПРАВІЛЬНЫ АБУТАК ДЛЯ НЯПРАВІЛЬНАЙ СТУПНІ

Калі дзіця развіваецца правільна, то пачынае хадзіць да канца першага года. Паскараць гэты момант ні ў якім разе нельга, хоць малыя нярэдка спрабуюць стаць на ножкі раней. Усё ж такі гэта празмерная нагрузка для крохкіх і гібкіх касцей, слаба развітых мышцаў. У выніку можа ўзнікнуць дэфармацыя і плоскаступнёвасць, якая з гадамі абумовіць шмат праблем з суставамі.

Плоскаступнёвасць — гэта дэфармацыя ступні, яе зводаў. Ступня складаецца з многіх касцей, звязак, сухажылляў і мышцаў, якія ўтвараюць два зводы, папярочны і падоўжны. Каб вытрымаць хаду, бег, падскокі, перанос цяжару, нам патрэбна трывалая ступня, добры фундамент. Добрая ступня дапамагае трымаць раўнавагу, амартызуе нагрузку, абараняе каленны, тазасцегнавы і галёнкаступнёвы суставы і нават пазваночнік.

Плоскаступнёвасць сустракаецца фактычна ў кожнага пятага школьніка, хоць большасці з нас ад нараджэння дастаюцца здаровыя ногі, і ад нас саміх залежыць, ці захаваем мы іх у парадку да старасці.

Даволі цяжка не заўважыць патаўшчэнне ступні, яе пашырэнне ў пярэдняй і сярэдняй частцы, апушчаны падоўжны звод. Звод папярочны — гэта выемка каля пальцаў ступні, калі яе няма, вялікі палец скрыўляецца, а з узростам расце костачка, на падэшве ўтвараецца натоптыш, цвёрды мазоль. Дзеці з такой праблемай могуць скардзіцца на боль у нагах, стомленасць, асабліва пасля працяглай хады. Не пакідайце гэтыя скаргі без увагі.

— У першую чаргу падбярыце дзіцяці правільны абутак з самага малога ўзросту, — кажа **ўрач лячэбнай фізкультуры 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Антаніна ТОПТУН**. — Абутак павінен быць па памеры, з натуральнай, эластычнай скуры, гнуткі, з добрай амартызацыяй. Абавязковы атрыбут — абцас. Недапушчальна набываць абутак з адкрытай пяткай! Самы вялікі вораг ступні — высокія і касыя абцасы, падэшвы-платформы. Насок не павінен сціскаць пальцы, але і не павінен быць надта прасторным. Неабходна выкарыстоўваць і сцелькі-супінатары, якія будуць падтрымліваць натуральную вышыню зводаў ступні (прадаюцца ў спецыяльных магазінах — там жа ёсць і гатовы артапедычны абутак).

Умацаваць ступню дапаможа лячэбная гімнастыка, але пры ўмове, калі выконваць яе штодня. Практыкаванні лепей рабіць раніцай, пакуль мышцы не стаміліся. Паўтараць кожнае практыкаванне варта да 10-12 разоў.

- **Садзімся і ставім ступню на край вялікай тоўстай кнігі, сціскаем пальцы, абхопліваючы гэты край.**
- **Захопліваем пальцамі розныя дробныя прадметы і пераносім іх на іншае месца.**
- **Прыціскаем да падлогі мяч і катаем яго па чарзе кожнай нагой.**
- **Згінаем пальцы і трымаем 3—6 хвілін.**
- **Наступаем на палку нагой і катаем яе.**
- **Падцягваем пальцамі маленькі дыванок.**
- **Становімся басанож на падлогу, раўняем наскі, адначасова згібаем пальцы ступняў і не адрываючы пяткі рухаемся вусенічным крокам наперад.**
- **Ідзём на насках у поўным прыседзе.**
- **Робім перапады з наскоў на пяткі.**
- **Ходзім на насках, пружынячы крок.**
- **Ходзім на пятках, вонкавым і ўнутраным краі ступні.**
- **Ходзім басанож па камянях, пяску, траве, рыхлай зямлі.**

Каб пазбегнуць падобных праблем, трэба яшчэ мець правільную постаць, штодня займацца лячэбнай гімнастыкай, спортам, весці рухавы лад жыцця.

■ Сучасныя выклікі

ЗЛОСНЫ ВОРАГ ЗРОКУ

Афтальмолагі з Вялікабрытаніі высветлілі: злоўжыванне гаджэтамі можа прывесці да міяпіі

Бацькі нярэдка падсоўваюць дзіцяці тэлефон, iPad або ўсаджваюць перад тэлевізарам, каб вызваліць свой час, прычым нярэдка толькі для таго, каб самім пасядзець у сетках. Такое бескантрольнае, неабмежаванае выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій і тэлевізара прыводзіць да павелічэння групы рызыкі сярод дашкольнікаў і малодшых школьнікаў па ўзнікненні міяпіі — блізарукасці. А ў тых, хто ўжо мае такі дыягназ, яна хутчэй прагрэсуе, адзначае ўрач-афтальмолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Аксана АЛАДКА.

Гаджэты з'явіліся ў жыцці сучасных людзей у 1997 годзе. З таго часу колькасць людзей з цяжкай блізарукасцю выросла на 35 працэнтаў! Але і гэта не мяжа, мяркуюць спецыялісты: працэнт будзе расці, таму што сярэднестатыстычны чалавек выкарыстоўвае смартфон не менш за дзве гадзіны ў дзень. Аднак гэта яшчэ б нічога, але мы ў дадатак карыстаемся цягам дня ноўтбукам, персанальным камп'ютарам, тэлевізарам. Што да дзяцей і падлеткаў, то заўважана: падчас прагляду фота- і відэаролікаў яны трымаюць смартфон за 30 см ад твару, а некаторыя скарачаюць гэту адлегласць і да 18 см. Тыя ж кнігі і газеты чалавек звычайна трымае за 40 сантыметраў ад твару.

Камп'ютары, планшэты, тэлефоны — самі па сабе ворагі зроку, а для дзяцей — у значна большай ступені. Калі дзеці ідуць у школу, у іх ужо ў першым-другім класе імкліва пачынае зніжацца зрок. А ўсё ад таго, што вочы сутыкаюцца з моцнай нагрузкай. Аднак калі прыняць меры, зрок можа аднавіцца.

Гульні на планшэце, смартфоне, камп'ютары, ноўтбуку вельмі непажаданыя. Таму што любая гульня патрабуе максімальнага напружання, каб нічога не ўпусціць. Азарт прымушае забыць, што такое «аптымальная дыстанцыя», і прыцягвае галаву да крыніцы карцінкі. Вочы аказваюцца вельмі блізка да манітора, да таго ж яны моцна напружваюцца, вельмі рэдка міргаюць і перасыхаюць. Сігналы аб агульнай стомленасці, перагрузцы вачэй не распазнаюцца.

Экран тэлевізара павінен знаходзіцца на адлегласці не менш як 3 метры, экран планшэта або камп'ютара падчас прагляду таго ж фільма ці мультфільма — на адлегласці не менш як 1,5-2 метры, пры выкарыстанні развіваючых і гульнявых праграм — не менш як 33 см. Асвятленне пры гэтым у пакоі павінна быць дастаткова, святло ад лямпы — «цёплым».

Чым меншы экран, тым большая нагрузка на зрок. Найбольшыя праблемы ўзнікаюць у дзяцей пры выкарыстанні PSP і сэнсарных тэлефонаў.

ЯК ДАЗІРАВАЦЬ ГАДЖЭТЫ І ТЭЛЕВІЗАР?

Узрост (гады)	Камп'ютар (хвілін за 1 раз)	Тэлевізар (хвілін за 1 раз)
1,5-2	—	5-10
3-4	—	15-20
5-7	10	30-60
8-11	15	60
12-13	20	60
14-15	25	60
16-17	30	90
18+	60	90

Работа на блізкай адлегласці (чытанне, пісьмо, маляванне, збор канструктара, мазаікі) павінна ажыццяўляцца за сталом, пры добрым асвятленні. Крыніца святла павінна быць злева, пры гэтым асвятленне ў пакоі таксама павінна быць дастаткова. Не дапускайце, каб дзіця чытала лежачы ў ложку.

Каб не дапусціць міяпіі, нам патрэбны...

...зрокавы рэжым;

...гімнастыка для вачэй;

...фізкультура, калі няма спецыяльных проціпаказанняў;

...збалансаванае харчаванне, вітамінатэрапія;

...спартыўныя гульні з мячом (тэніс, баскетбол, валейбол і інш.), плаванне, прагулкі на свежым паветры.

НАДТА БЛІЗКАЯ АДЛЕГЛАСЦЬ

Ад міяпіі пакутуе кожны трэці жыхар планеты, а таму з першых дзён жыцця трэба памятаць аб прафілактыцы.

Якой будзе прафілактыка блізарукасці ў дзяцей?

1. Першыя дзіцячыя кнігі павінны быць з буйнымі, добра бачнымі карцінкамі, што дазваляе пазбегнуць зрокавага напружання.

2. Пакой — светлы, добра асветлены. Нельга дапускаць, каб дзіця гуляла з дробнымі прадметамі, разглядала карцінкі або малявала пры слабым асвятленні.

3. Пісаць і маляваць — толькі за сталом. Адлегласць ад вачэй пры гэтым — каля 30 см.

4. Дзецям да 3 гадоў не рэкамендуецца глядзець тэлевізар. Далей час трэба дазіраваць.

5. Першыя кнігі для самастойнага чытання павінны мець буйны шрыфт. Адлегласць да кнігі — 33 см. Лежачы — не чытаць.

6. У харчаванні павінна быць дастатковая колькасць вітамінаў А, С, караціну і кальцыю.

Якой будзе прафілактыка блізарукасці ў дарослых?

1. Нельга чытаць лежачы, асабліва на баку, паколькі пры гэтым вочы знаходзяцца на рознай адлегласці ад тэксту.

2. Не рэкамендуецца чытаць у транспарце, бо пры пастаянным руху вачамі штосекундна даводзіцца факусіраваць вочы на новую, зменяную адлегласць, што моцна стамляе мышачны апарат вока.

3. Забяспечце правільнае асвятленне рабочай паверхні. Святло павінна падаць злева. Лямпа павінна быць прыкрытай так, каб прамыя промні святла не траплялі ў вока.

4. Тэлевізар не варта глядзець у поўнай цемры, калі адключана знешняе асвятленне. Выява на экране пры гэтым здаецца больш кантраснай, і праз нейкі час вялікая розніца паміж яркім свячэннем экрана і цёмным фонам пакоя выклікае зрокавую стомленасць.

5. Падчас работы за камп'ютарам размяшчайце манітор крыху вышэй за ўзровень вачэй і на адлегласці 35—40 см. Асвятленне экрана — роўнае асветленасці памяшкання. Рабіце перапынак на 5-10 хвілін праз кожную гадзіну работы. Максімальна дапушчальная працягласць няспыннай работы за маніторам не павінна перавышаць 2 гадзіны. У перапынку трэба адарвацца ад экрана, размяцца, выканаць гімнастыку для вачэй.

«Вока чалавека ўладкавана такім чынам, што калі мы глядзім удалечыню, яно расслабляецца, а для разгляду прадметаў на блізкай адлегласці патрабуецца актыўны ўдзел вочных мышцаў, — тлумачыць **урач-афтальмолаг 24-й гарадской паліклінікі спецмедаглядаў Таццяна ІВАНОВА.** — Пастаяннае напружанне выклікае адчуванне цяжару, боль у вачах, пагаршэнне зроку. Таму рэгулярны адпачынак вельмі важны. У процілеглым выпадку будзе развівацца спазм, і калі своечасова яго не зняць, то паступова з'явіцца блізарукасць...

Існуе шэраг практыкаванняў для трэніроўкі і прафілактыкі міяпіі, выконваць якія можна седзячы на працоўным месцы. Гімнастыка будзе эфектыўнай, калі выконваць яе мінімум двойчы на дзень па 3—5 хвілін.

Вельмі важным будзе актыўны лад жыцця. Сябруйце з бегам, плаваннем і веласіпедам. Майце пры гэтым на ўвазе, што пад'ём цяжару, адзінаборствы, скачкі ў ваду, наадварот, павялічваюць рызыку развіцця і прагрэсавання міяпіі».

■ Псіхалогія для ўсіх

А РАПТАМ...

Ці можна перастаць трывожыцца?

Трывога час ад часу ўзнікае ў кожнага з нас, праўда, пры гэтым яна бывае «нармальнай», звязанай з канкрэтнай стрэсавай сітуацыяй. Знікае сітуацыя — знікае і трывога. У такім выпадку яна нават мабілізуе актыўную асобу. Нармальная трывога мае станоўчае значэнне для дасягнення мэты, яна прыводзіць у дзеянне і запускае маторны феномен, у выніку чаго трывога падае. Сітуацыйная трывога мае прафілактычнае значэнне, бо сігналізуе чалавеку аб небяспецы і пабуджае да дзеянняў.

Аднак бывае і паталагічная трывога — гэта пачуццё, якое з чалавекам пастаянна, незалежна ад абставін. Гэтае пачуццё нібыта жыве сваім уласным жыццём, становіцца пастаянным эмацыянальным фонам з рэзкімі ўсплёскамі актыўнасці ў любых нявызначаных і неспрыяльных сітуацыях. Коратка такое пачуццё можна апісаць як нейкае перажыванне «а раптам», і тут няма дэталяў, а ёсць толькі адчуванне катастрофы.

Што вы можаце адчуваць? Сэрцабіцце, боль у сэрцы, сухасць у роце, слабасць, стан страты прытомнасці. Пульс пачашчаецца, паветра не хапае, галава кружыцца, становіцца то горача, то холадна. Магчымы ўнутраныя дрыжыкі, цяжкасці з глытаннем, млосць, дыярэя...

Можа быць пачуццё прыгнечанасці, бездапаможнасці, няўпэўненасці, небяспекі, цяжкасці з канцэнтрацыяй увагі...

У паводзінах гэта праяўляецца дэзарганізаванасцю, заціснутасцю, напружаннем, павышанай стамляльнасцю, чалавек становіцца неспакойным, мітуслівым, раздражняльным.

Такія людзі могуць скардзіцца тэрапеўту на пад'ёмы ціску, галаўны боль, задышку і боль за грудзінай, аняменне пальцаў, пачуццё гарачыні. Чым вышэйшы ўзровень трывогі, тым цяжэй чалавеку вярнуцца ў стан унутранай раўнавагі.

«Галоўнае — памятаць, што трывога часта звязана з думкамі, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Інга СВЯТОШЧЫК.** — Часта крыніца пачуцця трывогі знаходзіцца ў самім чалавеку, а не ў навакольлі. Існуюць пэўныя паводзінскія рэакцыі, якія сам ён не ўсведамляе. І такія рэакцыі актывізуюць і падтрымліваюць пачуццё трывогі. Пазбавіцца ж яго можна толькі калі выявіць гэтыя рэакцыі і замяніць іх на іншыя, карысныя для пацыента. Змяніць лад думак і характар дзеянняў вельмі няпроста, але магчыма. Асабліва калі пачаць узаемадзейнічаць з псіхатэрапеўтам».

■ Пералік прэпаратаў

КРОПЛІ АД НАСМАРКУ

Мы прастуджваемся пад уздзеяннем холаду, які зніжае імунітэт. Мікробам толькі таго і трэба — яны пачынаюць хутка размнажацца. Вось і насмарк.

Бывае, праўда, што ў запаленні слізістай абалонкі носа вінаватыя нейкія раздражняльнікі — механічныя або хімічныя (вядомы насмарк мукамола, каменячоса ці таго ж слесара). Цяжкія, буйныя часціцы пылу могуць механічна пашкоджваць эпітэлій і выклікаць запаленне.

Шмат негатыўных фактараў — шмат і прэпаратаў для барацьбы.

— У якасці асноўнай тэрапіі дарослым рэкамендуюцца сасудазвужальныя і супрацьмікробныя прэпараты, — зазначае **ўрач-атарыналарынголаг цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі №2 г. Мінска Вольга СТАРАВОЙТАВА.** — У склад кропляў і спрэяў уваходзяць, напрыклад, нафцізін, оксіметазалін, эфедрын, якія аказваюць супрацьацёчнае дзеянне, яны змяншаюць прыток крыві, і чалавеку становіцца лягчэй дыхаць. Антыбактэрыяльнае ўздзеянне аказваюць сульфаніламідныя прэпараты, неаміцын, ёдынол... Хутка зменшыць запаленне і зняць ацёк слізістай можна з дапамогай глюкакортыкастэроідаў — дэксаметазону, гідракартызону, флутыказону і інш. Антыгістамінныя прэпараты эфектыўна пазбаўляюць свербу і знімаюць ацёк. Прэпараты ментолу, эўкаліпту, камфары, бораментол адносяць да ліку сродкаў, якія, што называецца, адцягваюць увагу.

Любыя водныя або масляныя кроплі, інгаляцыі нельга праводзіць больш за 8-10 дзён (у рэдкіх выпадках урач прызначае да 2 тыдняў). Таму што працяглае прымяненне абумоўлівае развіццё паталагічнага працэсу.

У лячэнні насмарку прымяняюцца і солевыя растворы для прамывання носа, ёсць прэпараты серабра (пратаргол) — гэта антысептык з супрацьзапаленчым, вяжучым эфектам; мукалітыкі — ацэцілцыстэін, натрыя гідракарбанат — разжыжаюць слізь і спрыяюць яе вывядзенню. Акрамя таго, могуць прызначацца і імунамадулятары — для павышэння агульнай устойлівасці арганізма.

Сродкі для лячэння насмарку вельмі разнастайныя, могуць уключаць у свой склад адзін або некалькі кампанентаў. Так што каб не патраціць грошы дарма, парайцеся з вашым урачом.

■ Можна запытацца

ЯК СЁННЯ ЛЕЧАЦЬ АРТРЫТ?

Па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў многіх краінах 12 кастрычніка праводзіцца дзень барацьбы з артрытам. Увага грамадскасці прыцягваецца да магчымасцяў дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі пацыентаў, якія пакутуюць ад рэўматычнай паталогіі.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне асоб з рэўматычнымі захворваннямі «Шлях да жыцця» (revmo.by) арганізуе ў гэты дзень у 11 гадзін у 6-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска (вул. Уральская, 5, 5-ы корпус, 2-і паверх; актавая зала) тэматычную канферэнцыю «Немедыкаментозныя і медыкаментозныя метады лячэння рэўматычных захворванняў».

У межах канферэнцыі спецыялісты раскажуць пра фізіятэрапеўтычныя метады лячэння захворванняў суставаў; малаінвазіўную хірургію гонартрозу, калі можна захаваць сустаў, мінімальна траўміраваць тканкі; аб выкарыстанні метаду прыкладной кінезіялогіі для пацыентаў з паталогіяй суставаў (гэта метад альтэрнатыўнай медыцыны, заснаваны на сувязі мышачнага тонусу са станам унутраных органаў і сістэм арганізма); артэзаванне ступняў у сістэме кантролю і карэкцыі функцыянальнага стану апорна-рухальнага апарату (артэзаванне — гэта прымяненне знешніх прыстасаванняў для разгрузкі, фіксацыі, актывізацыі і карэкцыі ступні). Пасля выступленняў можна будзе задаць свае пытанні кваліфікаваным спецыялістам. Уваход свабодны.

РАЗ'ЮШАНАСЦЬ НА ПУСТЫМ МЕСЦЫ

Пазбавіцца ад гневу дапамогуць спорт і музыка

Бывае, мы крычым, злуёмся, нас раздзірае ад адмоўных эмоцый, але... дзеля чаго ўсё гэта? Як правіла, наш «праведны гнеў» не мае ніякіх падстаў. Гнеў — звычайная рэакцыя на канкрэтную сітуацыю і абставіны, і ён ні ў якім разе не павінен стаць нашай пастаяннай эмоцыяй. Усё жыццё тады пойдзе пад адхон — і кар'ера, і асабістае жыццё, і дзеці, і сябры. Так што вучыцеся кіраваць гневам, пакуль не позна.

Псіхолагі ўстанавілі, што людзі, якія пастаянна знаходзяцца ў палоне гневу, часта хварэюць. У іх парушаецца, напрыклад, работа страўнікава-кішачнага тракта, нават печані.

«Падаўляць у сабе гнеў нельга — гэта можа прывесці да дэпрэсіі, — расказвае **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіна САСНОЎСКАЯ.** — Адчуваеце злосць, раз'юшанасць, сапраўднае шаленства? Адкуль у чалавека бяруцца такія эмоцыі? Прычынай можа быць боль, адчуванне якога прымушае чалавека страціць кантроль над сітуацыяй і над сабой. Гнеў можа быць абумоўлены плёткамі, здрадай, падманным абяцаннем, словам, эмоцыя нараджаецца не на пустым месцы. Але існуе і злосць, якая не мае прычыны, а ўзнікае толькі таму, што свет не адпавядае патрабаванням чалавека. І тады гнеў накіроўваецца на ўсё навокал».

Што ўзмацняе гнеў? Фізічны і душэўны боль, уздзеянне алкагольных і наркатычных сродкаў, няўдачы ў кар'ерным і асабістым жыцці, стрэсы, трывогі, падазрэнні.

Як выглядае гнеў? Усе мышцы напружаныя, рукі сціснутыя ў кулак; па целе бегаюць мурашкі; становіцца то горача, то холадна; узмацняецца сэрцабіцце.

Дыхайце ў гэты момант спакойна і роўна.

Палічыце самі сабе да дзесяці, паслухайце музыку.

Расслабцеся і пастарайцеся выкінуць з галавы ўсе думкі. Гэта будзе няпроста ў стане афекту, але варта пастарацца. Усё гэта дапаможа часова стрымаць гнеў, але трэба яшчэ вывесці яго. Каб поўнасцю супакоіцца і апамятацца, неабходна выпусціць пар. Паспрабуйце наогул заняцца актыўным спортам, а ў гэтым канкрэтным выпадку ідэальна пабіць баксёрскую грушу, выбіць на вуліцы дыван венікам. Паверце, гэта вельмі важна: сабраць усю злосць і пазбавіцца ад яе ў якой-небудзь фізічна актыўнай справе, каб з кожным рухам адмоўная эмоцыя бясследна раставала.





Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды сроком 3 года изолированного помещения, инв. № 110/D-2750508 (назначение – помещение транспортного назначения, наименование – подземный гараж-стоянка), арендуемой площадью 1193.9 кв.м по адресу: г. Барановичи, ул. Димитрова, д. 15, пом. 67
Начальная цена продажи	4 059,26 р. (четыре тысячи пятьдесят девять рублей двадцать шесть копеек) с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	2,0
Сумма задатка	405,93 р. (четыреста пять рублей девяносто три копейки)
Условия аукциона	Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения гаража-стоянки, складских, производственных, торговых помещений
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 420/С-4750 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), арендуемой площадью 175.74 кв.м. по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, д. 8
Начальная цена продажи	597,52 р. (пятьсот девяносто семь рублей пятьдесят две копейки) с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	2,0
Сумма задатка	59,75 р. (пятьдесят девять рублей семьдесят пять копеек)
Условия аукциона	Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения складских, производственных, офисных помещений
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8-0163-42-25-08
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 08 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: - заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; - *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; - *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; - *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: - представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; - физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; - представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)	
Последний день приема заявлений – 01 ноября 2016 г. до 15.00	

Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды сроком 5 лет части гаража для автопогрузчиков площадью 122,8 кв.м по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 76А.
Начальная цена продажи	225,45 р. (двести двадцать пять рублей сорок пять копеек) с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды (либо размер арендной платы)	0,54 базовой арендной величины за 1 кв.м (коэффициенты 0,3*0,9*2)
Сумма задатка	23 р. (двадцать три рубля)
Условия аукциона	Целевое назначение арендуемых помещений – складское помещение, производственное помещение
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичский грузовой центр транспортной логистики, 225413, г. Барановичи, ул. Брестская, 272, тел. 8-0163-49-27-28
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 09 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	
